

НА НОВЫ ГОД
БЕЗ ЦУКЕРАК
НЕ ЗАСТАНЕМСЯ
3



ПРАГНАЗУЕМ
БУДУЧЫ ЎРАДЖАЙ
12

26 КАСТРЫЧНІКА 2023 г.
ЧАЦВЕР
№ 208 (30088)

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
ЗВЯЗДА

# ЯЕ ДРУГОЕ ПАКАЛЕННЕ



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Дар'я БІРУКОВА працуе выхавацелем у 98-м дзіцячым садку сталіцы без малога чвэрць стагоддзя. У далёкім ужо 1999 годзе выпускніца гістфака БДУ прыйшла працаваць у дзіцячы садок, у першую малодшую групу, куды хадзілі малыя да трох гадоў. І зразумела: яна на сваім месцы, гэта яе пакліканне.

Сёння ў групу да Дар'і ходзіць двухгадовая Арына, маці якой была калісьці ў першай групе маладой выхавацелькі. Такая вось змена пакаленняў.

Эканамікс

## СТАНОЎЧАЯ ДЫНАМІКА — ПА ЎСІХ КІРУНКАХ

### Анатоль СІВАК расказаў аб мерах павышэння эфектыўнасці работы будаўнічага і транспартнага комплексаў краіны, жыллёва-камунальнай гаспадаркі

**Падчас сумеснага пасяджэння Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі намеснік прэм'ер-міністра ахарактарызаваў сітуацыю ў гэтых сферах і зрабіў прагнозы на будучы год. Па-ранейшаму ўвага дзяржавы будзе накіравана на нарошчванне аб'ёмаў будаўніцтва жылля, рост экспартных перавозак, паляпшэнне жыллёвых умоў насельніцтва. Павялічацца тэмпы рамонту дарог, у тым ліку мясцовага значэння. Задача па забеспячэнні ўсіх спажыўцоў якаснай пітной вадой будзе выканана.**

### ПАВЕЛІЧЭННЕ КВАДРАТНЫХ МЕТРАЎ І СПРАШЧЭННЕ ПРАЦЭДУРЫ БУДАЎНІЦТВА

Кажучы аб развіцці будаўнічага комплексу, віцэ-прэм'ер звярнуў увагу на залежнасць галіны ад дынамікі інвестыцый. З мэтай актывізацыі інвестыцыйнай актыўнасці ў папярэднім і бягучым гадах кіраўніком дзяржавы і на ўзроўні ўрада прыняты шэраг рашэнняў у сферы сельскай гаспадаркі, прамысловасці, транспарту, інфраструктурных праектаў, праектаў у сацыяльнай сферы.



Фота БелТА.

«За дзевяць месяцаў 2023 года на будоўлі накіравана 11,9 млрд рублёў, што ў супастаўных цэнах складае 106,4 % да ўзроўню мінулага года, — дадаў ён. — Гэта дазволіла загрузіць існуючыя вытворчыя магутнасці і выйсці на станоўчыя паказчыкі работы ў галіне. Аб'ёмы падрадных работ за дзевяць месяцаў 2023 года ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года выраслі на 12,3 %, валавая дабаўленая вартасць у будаўніцтве павялічылася на 9,7 %, што дазволіла галіне забяспечыць станоўчы ўклад у фарміраванне ВУП у памеры 0,4 працэнтнага пункта».

Пры гэтым актыўна нарошчваюцца аб'ёмы будаўніцтва і за межамі краіны: перш за ўсё на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі. «Тэмпы экспарту будаўнічых, інжынерных і архітэктурных паслуг склалі 117,3 % (гэта без малога 500 млн долараў ЗША), — удакладніў намеснік кіраўніка ўрада. — Гэтаму садзейнічае работа, якая праводзіцца ва ўзаемадзеянні з урадам Расійскай Федэрацыі, па актыўным выхадзе беларускіх падрадных арганізацый на рынкі расійскіх рэгіёнаў».

Па выніках работы за дзевяць месяцаў у нашай краіне ў эксплуатацыю ўведзена 2,6 млн кв. метраў жылля, у тым ліку 690 тысяч кв. метраў з дзяржаўнай падтрымкай. Доля індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва ў агульным аб'ёме ўведзенага ў эксплуатацыю жылля склала 50,1 %. Паказчык па забяспечанасці насельніцтва жыллём па выніках 2022 года — 29,4 кв. метра на чалавека, што перавышае ўстаноўлены ў Праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2021—2025 гады.

З улікам росту затрат на капітальны рамонт жыллёвага фонду, наяўнасці вялікай колькасці жылля, не забяспечанага інжынернай інфраструктурай, асабліва ў сельскай мясцовасці, у рамках Канцэпцыі дзяржаўнай жыллёвай палітыкі Рэспублікі Беларусь да 2030 года плануецца зрабіць асноўны акцэнт на забудове, рэнавацыі і рэканструкцыі жылых тэрыторый, якія ўжо існуюць. Асаблівая ўвага будзе нададзена і не прыдатнаму для пражывання жыллю.

«Адначасова разглядаюцца пытанні стварэння ўмоў, накіраваных на стымуляванне дзяржаўных арганізацый да ажыццяўлення будаўніцтва арэнднага жылля за кошт уласных і пазыковых сродкаў з далейшым выдзяленнем гэтага жылля сваім работнікам на вызначаных імі ўмовах, — паведаміў Анатоль Сівак. — Яшчэ адзін напрамак — далейшае развіццё індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва.

СТАР. 2

ЦЫТАТА ДНЯ



**Раман ГАЛОЎЧАНКА, прэм'ер-міністр:**

*«Трэба будзе выканаць складаную і адказную работу па забеспячэнні святкавання 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне на самым высокім узроўні — як на рэспубліканскім, так і на мясцовым. Самае галоўнае — не дапусціць фармалізму і правядзення мерапрыемстваў дзеля птушачкі. Калі такое, не дай бог, здарыцца, гэта будзе галоўным недахопам нашай работы. Тут трэба знайсці месца прадстаўнікам усіх груп насельніцтва, кожнаму, хто лічыць сябе патрыётам Айчыны. Ключавыя ўрачыстыя падзеі пройдуць у сталіцы, але не менш важна правесці на вельмі высокім узроўні мерапрыемствы ва ўсіх кутках нашай краіны».*

Працяг тэмы

## ЯКАЯ ШКОЛА НА... СМАК?

**Эксперымент па ўдасканаленні школьнага харчавання, які праводзілі ў некаторых школах краіны ў мінулым годзе, быў адобраны вучнямі і бацькамі, таму новую сістэму пакрысе пачынаюць уводзіць ва ўсіх установах адукацыі. Вядома, што «пераключыцца» адначасова ва ўсіх школ не атрымаецца па пэўных прычынах, аднак некаторыя ўстановы паўночнага рэгіёна даволі паспяхова выкарыстоўваюць новыя падыходы ў арганізацыі харчавання. Карэспандэнт «Звязды» завітала ў гарадскую і сельскую школы, каб даведацца, што ўяўляюць сабой пазіцыі «Экзотыка» і «Фантастык», якія нядаўна з'явіліся ў новым меню школьнікаў.**

### Эксперыментальны салатны ход



На сняданку ў Акцябрскай сярэдняй школе.

У пілотным праекце на Віцебшчыне прымалі ўдзел тры ўстановы адукацыі, адна з якіх — гімназія № 1 г. Віцебска імя Ж. І. Алфёрава. Па новых методыках праекта гімназія працуе і цяпер, у ёй навучаюцца больш за тысячу дзяцей, якія штодзённа забяспечваюцца гарачым харчаваннем. З улікам таго, што ўстанова адукацыі працуе ў дзве змены, сталовая сустракае сваіх наведвальнікаў шэсць разоў на дзень! Пачатковая школа атрымлівае бясплатны сняданак, а сярэдняя і старэйшая — абед, кошт якога вар'іруецца ад 2,50 да 3,50 рубля ў залежнасці ад порцый для малодшых і старэйшых вучняў. Кожны абедзенны перапынак залу сталовай з утульнымі круглымі столікамі займаюць амаль 145 дзяцей.

СТАР.3

Далёкая дуга

## У стылі Вялікага

**Беларускія прадпрыемствы рыхтуюцца прадставіць экспартны патэнцыял краіны на VI Кітайскай міжнароднай выставе імпарту (China International Import Expo), якая пройдзе з 5 да 10 лістапада ў Шанхаі.**

Беларусь пакажа свае найлепшыя дасягненні ў маштабным краінавым павільёне, а таксама ў камерцыйных павільёнах, дзе госці выставы з усяго свету знаёмяцца непасрэдна з прадстаўнікамі прадпрыемстваў.

Беларускі краінавы павільён будзе афармлены ў стылі Вялікага тэатра Беларусі. Тут пройдуць выступленні салістаў оперы і музыкантаў аркестра Вялікага. Затым сцэнаператворыцца ў заліты святлом подыум, на якім адбудзецца паказ модных калекцый беларускіх дызайнераў: прадукцыю з лёну, вырабы з натуральнага футра пакажуць арганізацыі канцэрна «Беллегпрам» і Белкаапсаюза.

Акрамя таго, у краінавым павільёне пройдуць тэматычныя дні рэгіёнаў Беларусі.

Лінейку запатрабаваных беларускіх прадуктаў харчавання ў павільёне «Харчовая і сельскагаспадарчая прадукцыя» прадставяць больш як 30 кампаній, уключаючы вядомыя прадпрыемствы, якія ўваходзяць у канцэрны «Белдзяржхарчпрам» і «Брэстмясамалпрам». Навінкамі для кітайскага рынку стануць спецыяльна распрацаваныя цукеркі з сухога малака, а таксама пяць відаў горкага шакаладу ад кандытарскай фабрыкі «Камунарка». У павільёне наведвальнікаў чакаюць прэзентацыі, дэгустацыі прадукцыі, алкагольных і безалкагольных напіткаў, а таксама яркія шоу з майстар-класамі па прыгатаванні страў нацыянальнай беларускай кухні ад вядомага кухара Антона Каленіка.

Наведвальнікі выставы змогуць азнаёміцца з навукова-тэхнічнымі дасягненнямі і інавацыйнымі распрацоўкамі з нафтахімічнай і прамысловай сфер у павільёне «Высокатэхналагічнае абсталяванне і інфармацыйныя тэхналогіі».

У павільёне «Спажывецкія тавары» ўпершыню на кітайскім рынку будзе прадстаўлены брэнд «Мерч Першага». Калекцыя ўключае джэмперы, байкі і світшоты з эксклюзіўнымі цытатамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Біржавыя, мытныя, адукацыйныя і лагістычныя паслугі, распрацоўкі айчынных адукацыйных і навуковых устаноў, а таксама патэнцыял свабодных эканамічных зон краіны беларускія ўдзельнікі прадэманструюць у павільёне «Гандаль паслугамі». Арганізацыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі падбіраюць шырокі спектр навуковых распрацовак, якія могуць быць цікавыя кітайскім партнёрам.

На выставе імпарту ў Шанхаі запланавана правядзенне шырокай інфармацыйнай і культурнай праграмы.

У бягучым годзе чакаецца ўдзел у кітайскай выставе больш як 150 краін, якія прадстаўляюць рэгіёны Азіі, Афрыкі і Еўропы.

Арганізатарамі нацыянальнай экспазіцыі на выставе выступаюць Беларуская гандлёва-прамысловая палата і выставачнае ўнітарнае прадпрыемства «Белінтэрэкспа» БелГПП.

СТАР. 2

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Вядучыя банкі ЗША скарацілі каля 20 тысяч працоўных месцаў

Сёлета скарачэнні ў Citigroup Inc., Bank of America Corp., Morgan Stanley, Wells Fargo & Co. і Goldman Sachs Group Inc. склалі ў агульнай складанасці каля 20 тысяч працоўных месцаў, піша CNBC. Амерыканскія фінкампаніі актыўна павялічвалі штаты супрацоўнікаў падчас пандэміі COVID-19 у сувязі з ростам актыўнасці ў сектары. Аднак узмацненне жорсткасці грашова-крэдытнай палітыкі Федэральнай рэзервовай сістэмай прывяло да «астуджэння» амерыканскай эканомікі, зніжэння попыту на іпатэку, а таксама спаду актыўнасці ў сферы зліццяў і паглынанняў (M&A) і размяшчэння аблігацый. «Банкі скарачаюць выдаткі там, дзе яны могуць, паколькі перспектывы наступнага года застаюцца вельмі нявызначанымі», — адзначыў дырэктар па даследаваннях Janney Montgomery Scott Крыс Марынак. Па словах эксперта, рост колькасці дэфолтаў па карпаратыўных і спажывецкіх крэдытах у ЗША азначае, што банкам налета прыйдзецца звярнуцца да яшчэ больш сур'ёзных скарачэнняў рабочых месцаў.

### Італія працягне закрываць граніцы з еўрапейскімі краінамі

Італія можа працягнуць рабіць больш жорсткім кантроль пасля яго ўвядзення на граніцы са Славеніяй і пашырыць такую практыку для краін Еўропы. Пра гэта са спасылкай на міністра абароны краіны Гуіда Кразета паведаміла РІА «Новости». У інтэрв'ю Corriere della Sera ён заявіў, што неабходнасць закрыцця граніц разглядаецца з улікам падзей, якія адбываюцца. І калі ў будучыні два-тры мільёны сірыйцаў з Лівана адправяцца ў Еўропу, то ў Італіі могуць распачаць новыя меры. Міністр нагадаў пра існаванне рызыкі пранікнення адзіночных тэрарыстаў на тэрыторыю краіны пад выглядам мігрантаў. У Італіі ў павышаную гатоўнасць прыведзены ўсе праваахоўныя органы і спецслужбы. Краіна ўвяла кантроль на наземнай граніцы са Славеніяй 21 кастрычніка. Рашэнне будзе актуальнае дзесяць дзён і можа быць падоўжанае. Усяго адпаведныя меры прынялі дзевяць краін Шэнгенскай зоны.

### У сталіцы Індыі зафіксаваны найвышэйшы ўзровень забруджвання паветра сярод 110 гарадоў свету

Сезонныя пажары, якія адбываюцца пры расчыстцы сельскагаспадарчых угоддзяў, выхлапныя газы ад транспартных сродкаў, будаўнічыя работы, а таксама работа вугальных электрастанцый істотна ўплываюць на якасць паветра. Днямі індэкс якасці паветра PM2,5 (утрыманне ў паветры маленькіх часціц, здольных пранікаць у арганізм) у Нью-Дэлі падняўся да 346 мікраграмаў на 1 куб. м, што з'яўляецца найвышэйшым паказчыкам сярод 110 гарадоў свету, якія адсочваюцца швейцарскай кампаніяй-вытворцам сістэм ачысткі паветра IQ Air. Пра гэта паведаміла Bloomberg. Цяперашняя дрэнная якасць паветра выклікана падзеннем тэмпературы і нізкай хуткасцю ветру, адзначыў Анджу Гоэл, навуковы супрацоўнік Інстытута энергетыкі і рэсурсаў у Дэлі.

ISSN 1990 - 763X
23208
9 771990 763008

КОРАТКА

- **Нацыянальны аэрапорт Мінск за восем месяцаў абслужыў больш за 1,6 млн. пасажыраў.**
- «Беллегпрам» да канца года плануе адкрыць канцэпт-стар «Да дому» ў Грозным.
- **На БУТБ істотна выраслі экспартныя цэны на масла.**
- Медцэнтр «Унукі Гіпакрата» пазбавілі ліцэнзіі на меддзейнасць.
- **У Мінпрыроды заявілі аб змяншэнні колькасці забруджаных радыяцыяй земляў у Беларусі.**

Свет захапленняў

## Збіральнікі і паляўнічыя

### Што і навошта калекцыяніруюць людзі?

**Далёка не ўсе разумеюць, што прымушае людзей збіраць калекцыі і ў чым тут цікавасць і азарт. Мы вырашылі паразмаўляць з калекцыянерамі, каб даведацца, што яны збіраюць і навошта.**

Гэтымі днямі Беларускае рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне калекцыянераў правяло ў сталіцы дзясяты злёт, які сабраў уладальнікаў самых розных калекцый з усёй краіны. Былі і госці з-за мяжы.

— Наша аб'яднанне калекцыянераў падтрымлівае і развівае цікавасць у шырокіх пластоў насельніцтва да захавання гістарычнай спадчыны Беларусі і сусветнай культуры, — распавядае **старшыня праўлення Беларускага рэспубліканскага грамадскага аб'яднання калекцыянераў Барыс ВАСІЛЬЕЎ**. — Мы яднаем энтузіястаў-збіральнікаў прадметаў побыту, гісторыі і мастацтва.

СТАР. 12



Нумізматыка — адзін з кірункаў стварэння прыватных калекцый.

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!
У НОВЫ ГОД – СА СТАРЫМ СЯБРАМ!
Ідзе падпіска на I паўгоддзе 2024 года.
Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2024 года, у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.



# СТАНОЎЧАЯ ДЫНАМІКА — ПА ЎСІХ КІРУНКАХ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

З улікам патрабаванняў кіраўніка дзяржавы ўзвядзенне такіх індывідуальных жылых дамоў будзе праводзіцца пераважна ў раёнах існуючай забудовы на пустых зямельных участках, раней выдзеленых для гэтых мэт».

Для стварэння ўмоў для куплі фізічнымі асобамі гатовага індывідуальнага жылля замест самастойнага будаўніцтва, а таксама большага задзейнічання магутнасцяў будаўнічых арганізацый урадам сумесна з зацікаўленымі прапрацоўваецца пытанне стварэння спрошчанага парадку ўзвядзення будаўнічымі арганізацыямі жылых дамоў з далейшай іх рэалізацыяй насельніцтву. «Адыход ад неабходнасці захавання шэрагу будаўнічых норм і патрабаванняў да арганізацыі будаўніцтва, але без пагаршэння параметраў забудовы дасць магчымасць скараціць затраты на будаўніцтва і сфарміраваць прымальную для фізічных асоб цану», — патлумачыў намеснік прэм'ер-міністра.

У бягучым годзе па-ранейшаму асаблівая ўвага ўдзяляецца пытанням спрашчэння працэдур у будаўніцтве. На ўзроўні Прэзідэнта і ўрада прыняты шэраг нарматыўных прававых актаў, якія рэгулююць пытанні магчымасці прымянення пры будаўніцтве праектнай дакументацыі, распрацаванай па будаўнічых і тэхнічных нормах іншых краін, парадку фарміравання каштарыснага кошту, выключэння магчымасці дэлегавання праекціроўшчыку функцый і абавязкаў заказчыка, замяшчэння дзеючых тэхнічных кодэксаў новымі будаўнічымі нормамі і правіламі.

## ПЕРААРЫЕНТАЦЫЯ ЭКСПАРТНЫХ ГРУЗАЎ І НОВЫЯ НАПРАМКІ ПАЛЁТАЎ

Як канстатаваў намеснік прэм'ер-міністра, на працягу некалькіх апошніх гадоў, уключаючы бягучы, сітуацыя ў транспартнай галіне, эфектыўнасць яе работы ў многім залежаць ад зніжэння аб'ёмаў транзіту грузаў у напрамку Усход — Захад — Усход (гэта перш за ўсё грузы Расійскай Федэрацыі) і неабходнасці пераарыентацыі беларускіх экспартных грузаў. Меры, якія прымаюцца, прыводзяць да станоўчых тэндэнцый.

Што датычыцца перавозкі пасажыраў, па словах віцэ-прэм'ера, пасажыраабарот транспарту за студзень — жнівень 2023 года склаўся на ўзроўні 110,3 %. Станоўчая дынаміка датычыцца ўсіх відаў транспарту.

«З мэтай навядзення парадку ў сферы аўтамабільных перавозак пасажыраў падрыхтаваны праект Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб аўтамабільных перавозках пасажыраў», які прадугледжвае стварэнне дзяржаўнага інфармацыйнага рэсурсу «Рэестр аўтамабільных перавозак пасажыраў», — звярнуў увагу Анатоль Сівак. — У рэестр уключаюцца звесткі аб перавозчыках, транспартных сродках, кіроўцаў, дыспетчарах перавозак пасажыраў у нерэгулярных зносінах, дыспетчарах таксі і замацоўваюцца іншыя нормы, якія рэгулююць такую дзейнасць».

Што датычыцца сферы паветранага транспарту, падпісана міжурадавае Пагадненне з Расійскай Федэрацыяй аб спагнанні аэранавігацыйных і аэрапортавых збораў і тарыфаў, рэалізацыя якога дазволіць з 1 студзеня 2025 года забяспечыць роўныя тарыфныя ўмовы пры аказанні паслуг аэрапортаў і аэранавігацыйных паслуг эксплуатантам паветраных суднаў абедзвюх дзяржаў. Максімальна задзейнічаны флот пасажырскіх паветраных суднаў авіякампаніі «Белавія» па ўсіх адкрытых напрамках. Працягваецца работа па развіцці ўсходняга і паўднёвага напрамкаў палётаў для правядзення рэгулярных паветраных пасажырскіх перавозак.

«Работа па загрузцы Нацыянальнага аэрапорта Мінск засяроджана на прыцягненні авіякампаній, у першую чаргу расійскіх, а таксама развіцці новых напрамкаў для пасажырскіх і грузавых перавозак», — удакладніў віцэ-прэм'ер.

У галіне дарожнай гаспадаркі ў 2023 годзе на ўзвядзенне, рэканструкцыю і рамонт аўтамабільных дарог агульнага карыстання накіравана 1,4 млрд рублёў. Гэта, па словах намесніка кіраўніка ўрада, дасць магчымасць адрамантаваць каля трох тысяч кіламетраў дарог, у тым ліку 1,3 тысячы кіламетраў рэспубліканскіх і 1,7 тысячы кіламетраў мясцовых.

«У 2024 годзе на рэспубліканскія дарогі плануецца накіраваць 1,27 млрд рублёў, што дазволіць адрамантаваць і рэканструяваць больш за 1600 кіламетраў рэспубліканскіх аўтадарог, — расказаў Анатоль Сівак. — На рамонт мясцовых аўтадарог плануецца накіраваць 881 млн рублёў, што ў два разы больш, чым запланавана да вылучэння ў бягучым годзе. Гэта дазволіць адрамантаваць каля 2700 кіламетраў мясцовых дарог. Указаныя падыходы дадуць магчымасць выканаць даручэнне кіраўніка дзяржавы і прывесці ўсю сетку аўтадарог агульнага карыстання ў належны транспартна-эксплуатацыйны стан».

## ДАДАТКОВАЕ ФІНАНСАВАННЕ РАМОНТУ ДАХАЎ І ДАРОГ

Асобна віцэ-прэм'ер спыніўся на развіцці жыллёва-камунальнай гаспадаркі краіны. Аднымі з найбольш вострых і актуальных для насельніцтва застаюцца пытанні, звязаныя з эксплуатацыяй жыллёвага фонду, правядзеннем бягучага і капітальнага рамонту. Да 30 % зваротаў грамадзян прысвечана менавіта гэтай праблематыцы.

«Аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам штогод нарошчваюцца аб'ёмы капітальнага рамонту жылля, — канстатаваў Анатоль Сівак. — У 2022 годзе капітальна адрамантавана 3375 тысяч кв. метраў жылля. Гэта самы высокі паказчык за ўвесь час. Чакаецца, што і ў 2023 годзе аб'ёмы капітальнага рамонту жыллёвага фонду перавысяць леташнія. Заданне на гэты год — 3630 тысяч кв. метраў».

Сёлета фінансаванне капітальнага рамонту жылля на 59 % праводзіцца за кошт бюджэту і на 41 % за кошт сродкаў насельніцтва. Пры гэтым доля ўдзелу насельніцтва ў фінансаванні капітальнага рамонту скарацілася за год на 2,8 працэнтнага пункта.

З мэтай прывядзення ў належны стан дахаў шматкватэрных жылых дамоў і скарачэння колькасці прэтэнзій грамадзян на заліццё кватэр прыняты меры па выдзяленні на рамонт дахаў неабходнага фінансавання. Працягваецца і планамерная работа па замене ў шматкватэрных жылых дамах ліфтаў, якія адпрацавалі нарматыўныя тэрміны эксплуатацыі.

Кажучы аб добраўпарадкаванні прыдамавых тэрыторый, віцэ-прэм'ер паведаміў, што аблвыканкамам і Мінскаму гарвыканкаму даведзены заданні на 2023 год па рамонце (рэканструкцыі) 1548 прыдамавых тэрыторый шматкватэрных жылых дамоў. На 1 кастрычніка ўжо адрамантаваны 1502 прыдамавыя тэрыторыі, або 97 % ад гадавога задання.

Актыўна вядзецца і рамонт вулічна-дарожнай сеткі населеных пунктаў. На гэтыя мэты абласцям выдзелены дадатковыя сродкі з рэспубліканскага бюджэту ў агульнай суме на 100 млн рублёў. Прынята рашэнне аб нарошчванні ў 2024—2025 гадах аб'ёмаў рамонту вулічна-дарожнай сеткі на 15 % штогод з давядзеннем да 2025 года да 8,1 млн кв. метраў. Адпаведнае фінансаванне на гэтыя мэты будзе павялічвацца.

## ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ЯКАСНАЙ ПІТНОЙ ВАДОЙ І МІНІМІЗАЦЫЯ АБ'ЁМАЎ ЦВЁРДЫХ КАМУНАЛЬНЫХ АДХОДАЎ

Сфарміраваны рэгіянальныя комплексы мерапрыемстваў для рэалізацыі пастаўленай кіраўніком дзяржавы задачы па забеспячэнні ў 2025 годзе ўсіх спажыўцоў якаснай пітной вадой. «У рамках указаных комплексаў мерапрыемстваў на 1 кастрычніка ўведзены ў эксплуатацыю 110 станцый абезжалезвання вады, яшчэ на 32 станцыях вядуцца будаўніча-мантажныя работы, — канстатаваў Анатоль Сівак. — Завяршаецца распрацоўка і прыступаем да работы яшчэ на 13 станцыях. Пабудавана 7,7 кіламетра новых сетак водазабеспячэння з 9,8 кіламетра, прадугледжаных на год, 6,8 кіламетра сетак водаадвядзення з 13,9 запланаваных. Перападключаны да існуючых цэнтралізаваных сістэм водазабеспячэння з вадой нарматыўнай якасці восем населеных пунктаў з дзесяці запланаваных, уведзены ў эксплуатацыю тры ачышчальныя збудаванні сцёкавых вод з 16 запланаваных».

У выніку мер, якія прымаюцца, узровень забяспечанасці спажыўцоў водазабеспячэннем пітной якасці па выніках дзевяці месяцаў бягучага года складае 97,7 %, а па выніках года чакаецца выкананне мэтавага паказчыка ў 98 %.

Што датычыцца сферы абыходжання з цвёрдымі камунальнымі адходамі, галоўная задача, якую ставіць урад, — мінімізаваць аб'ёмы іх захавання. Працягваецца будаўніцтва рэгіянальных аб'ектаў па сартаванні і выкарыстанні цвёрдых камунальных адходаў. Ва ўрадзе сфарміравана часовая міжведамасная рабочая група пад кіраўніцтвам міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі, якой прааналізаваны бягучы стан сферы абыходжання з цвёрдымі камунальнымі адходамі, праблемныя пытанні, якія існуюць, намечаны шляхі іх вырашэння.

Як рэзюмаваў Анатоль Сівак, нягледзячы на тое, што статыстыка паказвае зніжэнне колькасці зваротаў, у жыллёва-камунальнай гаспадарцы трэба яшчэ вельмі шмат зрабіць, каб забяспечыць устойлівае зніжэнне зваротаў, а адпаведна і зніжэнне недахопаў у рабоце сферы. «Задачы, якія стаяць перад жыллёва-камунальнай гаспадаркай, вельмі зразумелыя, і ўрадам прымаюцца і будуць прымацца ўсе неабходныя меры для іх выканання», — падкрэсліў віцэ-прэм'ер.

**Вераніка КАНЮТА.**

Парламенцкі дзённік

# НОВАЯ РЭДАКЦЫЯ КОДЭКСАЎ І ЎМАЦАВАННЕ МІЖНАРОДНАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА

**На чарговым пасяджэнні 11-й сесіі Савета Рэспублікі сёмага склікання сенатары адобрылі праект Закона «Аб змяненні кодэксаў», ратыфікавалі шэраг міжнародных пратаколаў і пагадненняў.**

## РЭГУЛЯВАННЕ ГРАМАДЗЯНСКА-ПРАВАВЫХ АДНОСІН

Законапраект «Аб змяненні кодэксаў» прадугледжвае карэкціроўку Грамадзянскага, Банкаўскага, Працоўнага і Жыллёвага кодэксаў. У прыватнасці, удасканальваецца рэгуляванне сферы інтэлектуальнай уласнасці. Уводзіцца апцыён на заключэнне дагавора, калі адзін бок з дапамогай безадзыўнай аферты дае другому боку права заключыць адзін або некалькі дагавораў на ўмовах, прадугледжаных пагадненнем. Укараняецца дагавор рахунку эскроу, згодна з якім адзін бок (банк або нябанкаўская крэдытна-фінансавая арганізацыя) абавязваецца адкрыць другому боку спецыяльны рахунак для ўліку і блакіравання грашовых сродкаў, атрыманых з мэтай перадачы трэцяму боку пры надыходзе пэўных падстаў.

Акрамя таго, прадугледжваюцца безадзыўная даверанасць, пагадненне крэдытораў аб парадку задавальнення іх патрабаванняў да даўжніка, запэўненне ў абставінах. Удакладняецца парадак заключэння і выканання дагавора фінансавання пад уступку грашовага патрабавання (факторынгу). Змяняецца падыход да кампенсацыі шкоды, прычыненай грамадзянінам.

— У адносінах да Грамадзянскага і Банкаўскага кодэксаў змяненні і дапаўненні носяць канцэптуальны характар, Працоўнага і Жыллёвага — у большай ступені юрыдычна-тэхнічны характар, — адзначыў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей СІВЕЦ**. — Работа, звязаная перш за ўсё з карэкціроўкай Грамадзянскага кодэкса, дастаткова маштабная, праводзілася на працягу доўгага часу ў сілу значнасці грамадзянска-прававых адносін для кожнага суб'екта права: як фізічнай, так і юрыдычнай асобы. Праект Закона «Аб змяненні кодэксаў» разглядаўся на экспертным савеце Савета Рэспублікі. Вельмі шмат было зваротаў грамадзян, звязаных з неабходнасцю карэкціроўкі і ўдасканалення грамадзянска-прававых адносін.

— Законапраект прыводзіцца ў адпаведнасць з такімі заканадаўчымі актамі, як дэкрэты Прэзідэнта «Аб развіцці лічбавай эканомікі», «Аб развіцці прадпрымальніцтва», Указ «Аб страхавой дзейнасці» і іншымі. Акрамя таго, запаўняюцца прабелы ў рэгуляванні грамадзянска-прававых адносін, якія так ці інакш ужо актуальныя для нашага грамадскага жыцця, — удакладніў Сяргей Сівец. — Прыбіраецца шэраг састарэлых і ўжо неэфектыўных норм, якія страцілі сваё рэгулюючае значэнне. У цэлым, можна канстатаваць, што падрыхтаваны законапраект адпавядае духу часу, будзе эфектыўным рэгулятарам грамадзянска-прававых адносін, якія складваюцца, і ў поўнай меры здольны забяспечыць рэалізацыю грамадзянскіх правоў і законных інтарэсаў як суб'ектаў гаспадарання, так і фізічных асоб.

## ПРАМЫСЛОВАЯ КААПЕРАЦЫЯ, ФІТАСАНІТАРНЫЯ МЕРЫ І БЯЗВІЗ З ПАКІСТАНАМ

Парламентарыі ратыфікалі Пратакол аб унясенні змяненняў у Дагавор аб Еўразійскім эканамічным саюзе ад 29 мая 2014 года ў частцы аказання фінансавага садзейнічання пры рэалізацыі дзяржавамі — членамі Еўразійскага эканамічнага саюза сумесных кааперацыйных праектаў у галінах прамысловасці. ЕАЭС надзяляецца адпаведнымі паўнамоцтвамі па фінансавым садзейнічанні развіццю прамысловай кааперацыі за кошт сродкаў бюджэту саюза. Новы механізм фінансавання кааперацыі будзе спрыяць далейшаму тэхналагічнаму развіццю прамысловага сектара Еўразійскага эканамічнага саюза і стымуляваць інтэграцыйныя працэсы.

Ратыфікацыя Пратакола аб унясенні змяненняў у Дагавор аб Еўразійскім эканамічным саюзе ад 29 мая 2014 года прадугледжвае ўвядзенне дзяржавамі-членамі экстраных фітасанітарных мер адносна шкодных арганізмаў, якія не ўключаны ў адзіны пералік каранцінных аб'ектаў саюза і ўяўляюць фітасанітарную рызыку, на перыяд уключэння адпаведных шкодных арганізмаў у названы пералік або да атрымання вынікаў аналізу фітасанітарнай рызыкі ў адносінах да шкодных арганізмаў, які пацвярджае адсутнасць такой рызыкі.

Ратыфікавана Пагадненне паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Ісламскай Рэспублікі Пакістан аб адмене візавых патрабаванняў для ўладальнікаў дыпламатычных і службовых (афіцыйных) пашпартоў. Грамадзяне Беларусі і Пакістана, якія маюць сапраўдныя дыпламатычныя і службовыя (афіцыйныя) пашпарты, вызваляюцца ад неабходнасці атрымліваць візы для ўезду, выезду, праезду транзітам або знаходжання на тэрыторыі адпаведна Беларусі і Пакістана на працягу перыяду, які не перавышае 90 дзён у каляндарным годзе з даты першага ўезду.

**Вераніка КАНЮТА.**

# У стылі Вялікага

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## МАГЧЫМАСЦІ ДЛЯ ІНВЕСТЫЦЫЙ

Сёння Магілёўская вобласць актыўна падтрымлівае сяброўскія сувязі з кітайскімі правінцыямі Хэнань, Цзянсу, Хунань, Шэньсі, горадам Цяньцзінь. Паміж гарадамі, раёнамі вобласці і рэгіёнамі КНР заключана звыш дзясятка розных дакументаў аб супрацоўніцтве. За шэсць гадоў, пачынаючы з 2014 года, экспарт у Кітай вырас з 3,4 мільёна долараў да 61,4 мільёна.

— Штогод мы нарошчваем аб'ёмы паставак мясной і малочнай прадукцыі, лёну, кандытарскіх вырабаў, мінеральнай і газаванай вады, — удакладнілі ў Камітэце эканомікі Магілёўскага аблвыканкама. — Дарэчы, першым рэгіёнам, куды была адпраўлена магілёўская прадукцыя, стала правінцыя Хэнань. Сёлета гэтаму супрацоўніцтву споўніцца 20 гадоў. Амаль 16 гадоў працягваецца сяброўства з правінцыяй Цзянсу. За гэты час рэалізавана шмат сумесных праектаў. Самым «маладым» рэгіёнам, з якім Магілёўская вобласць вядзе супрацоўніцтва з 2019 года, стаў горад Цяньцзінь. Сёлета, падчас візіту Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў КНР, быў падпісаны План дзеянняў па развіццю супрацоўніцтва паміж Магілёўскай вобласцю і горадам Цяньцзінь на 2023—2025 гады. У маі ў Цяньцзінь прайшоў Тыдзень Магілёўскай вобласці.

Шостая міжнародная кітайская выстава імпартных тавараў і паслуг CIIE 2023 — яшчэ адзін шанц пашырыць супрацоўніцтва.

— Ёсць зацікаўленасць у рэалізацыі інвестпраекта ў гарадскім парку Падміколле ў Магілёве, яшчэ аднаго — у Бялыніцкім раёне, рэалізацыі сумесных праектаў у сферы прамысловасці, — адзначылі ў камітэце эканомікі Магілёўскага аблвыканкама. — На выставе прадставім таксама СЭЗ «Магілёў», раскажам аб яе перавагах. У выставе возьмуць удзел магілёўскі мясакамбінат, бабруйскае прадпрыемства «Чырвоны харчавік».

## А З ЛІСІЧКАМІ КАШТАВАЛІ?

На VI Кітайскай міжнароднай выставе імпарту, якая пройдзе 5—10 лістапада ў Шанхаі, Мінскую вобласць прадставяць два вытворцы малочнай прадукцыі.

Мінскі малочны завод № 1 прывязе ў Шанхай не толькі сухое малако, але і новыя сыры з лісічкамі і труфелем, сыр для гатавання бургераў. Сярод асартыменту прадукцыі, з якой вытворца будзе знаёміць патэнцыяльных кітайскіх спажыўцоў, таксама будуць малако для дзіцячага харчавання, вяршкі і замарожаныя сыркі. З асобнымі прадуктамі гэтага вытворцы ў Кітаі ўжо знаёмыя: завод пастаўляе ў Паднябесную сухое абястлушчанае малако і сыроватку, казеін і стэрылізаванае малако.

Другім удзельнікам выставы ў Шанхаі з Мінскай вобласці стане Слуцкі сыраробны камбінат. Ён рыхтуе да выставы лінейку безлактознай малочнай прадукцыі, сухія і натуральнамалочныя прадукты.

## І ТАВАРЫ, І ПАСЛУГІ

Ад Брэсцкай вобласці, акрамя прадстаўнікоў прадпрыемстваў, у Шанхай адправіцца афіцыйная дэлегацыя рэгіёна. У яе ўвайшлі прадстаўнікі аблвыканкама, кіраўніцтва Брэста, Бярозаўскага раёна, Свабоднай эканамічнай зоны «Брэст», сфер адукацыі і аховы здароўя.

У прэстыжнай выставе сусветнага ўзроўню бяруць удзел таксама прадпрыемствы харчовай прамысловасці вобласці.

У рамках VI Кітайскай міжнароднай выставы імпарту 6 лістапада адбудзецца дзень Брэсцкай вобласці, на якім будзе прэзентаваны эканамічны, інвестыцыйны, турыстычны, адукацыйны і медыцынскі патэнцыял рэгіёна. Апроч таго, выступіць вакальная група заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь народнага ансамбля песні і танца «Палескія зоры» імя У. В. Цурканава.

Апроч удзелу ў выставе, дэлегацыя вобласці наведае рэгіён-пабрацім — правінцыю Аньхой на ўсходзе Кітая. Асноўныя галіны эканомікі гэтай правінцыі — аўтамабілебудаванне, вытворчасць будаўнічых матэрыялаў, лекаў, прадуктаў харчавання, лагістыка, энергетыка і фінансавыя паслугі. Дарэчы, у гэтай правінцыі працуе Анхойская пілотная зона свабоднага гандлю, якая дэманструе імклівы рост аб'ёмаў экспарту і імпарту.

Па выніках візіту ў КНР Брэсцкая вобласць плануе падпісанне шэрагу міжрэгіянальных пагадненняў і камерцыйных кантрактаў.

## СЫРЫ З ТРУФЕЛЯМІ І «БУСІДА» З «БРЭЗАОЛАЙ»

Дэлегацыя Гродзенскай вобласці для паездкі на VI Кітайскую міжнародную выставу імпарту ў Шанхаі сфарміравана. У яе склад увайшло шмат буйных прадпрыемстваў рэгіёна, якія маюць аднаўленую лінейку прадукцыі і стабільны экспартны патэнцыял.

У рамках выставы запланавана правядзенне Дзён Гродзенскай вобласці. Мерапрыемства, якое пройдзе 7 лістапада ў самым буйным у свеце марскім порце, прадугледжвае прэзентацыю гандлёва-эканамічнага, інвестыцыйнага, культурна-турыстычнага патэнцыялу Гродзенскай вобласці. Мяркуецца падпісанне двухбаковых дагавораў. Адным з самых яскравых момантаў стане дэгустацыя беларускай прадукцыі. У гэтай якасці свае вырабы прадставяць ААТ «Малочны свет», «Лідахарчканцэнтраты», «Лідахлебапрадукт», «Слонімскі мясакамбінат».

Наведвальнікі VI Кітайскай міжнароднай выставы імпарту змогуць ацаніць смак гродзенскіх сыроў «Кронес» з белымі і чорнымі труфелямі, прадэгуставаць ёгурты, пудынгі і іншую прадукцыю «Малочнага свету». Дарэчы, прадпрыемства — лідар малочнай галіны Беларусі. Яго геаграфія паставак з кожным годам расце, а доля экспарту складае 50 працэнтаў агульнага аб'ему вытворчасці. «Малочка» гродзенскіх вытворцаў добра вядома і кітайскім спажыўцам.

Наведвальнікі змогуць пазнаёміцца з прадукцыяй мучных і мясных вытворцаў. Так, лідскія прадпрыемствы прадставяць мюслі з разнастайным асартыментам, прыправы, кукурузныя палачкі, макароны і шэраг іншай прадукцыі. Новую лінейку вырабаў прапануе для дэгустацыі Слонімскі мясакамбінат, дзе нядаўна пачалі выпускаць каўбасу «Бусіда» і «Брэзаола» з ялавічыны.

Акрамя вырабаў харчовых прадпрыемстваў, на выстаўку ў Шанхай адправіцца прадукцыя ААТ «ГроднаАзот» і Смаргонскага ліцейна-механічнага завода.

## МАГЧЫМАСЦІ ПАДЗВІНСКАГА ПАТЭНЦЫЯЛУ

Віцебшчына ў рамках Дзён рэгіёнаў Беларусі на VI Кітайскай міжнароднай выставе імпарту ў Шанхаі прадставіць апошнія сучасныя распрацоўкі ААТ «Нафтан», шкловалакно і матэрыялы на яго аснове ад ААТ «Полацк-Шкловалакно», адзенне, кухонны тэкстыль, пасцельную бялізну і сувенірную прадукцыю Аршанскага льнокамбіната, кандытарскія вырабы фабрыкі «Віцьба», сыры, мясныя паўфабрыкаты, натуральнамалочную прадукцыю, малочныя і мясныя кансервы дзяржаўнага аб'яднання «Віцебскі канцэрн «Мяса-малочныя прадукты». Свае праекты будзе прэзентаваць адміністрацыя Свабоднай эканамічнай зоны «Віцебск», чакаецца ўдзел лагістычнай кампаніі «Рузэкспедыцыя».

Сярод запрошаных гасцей будуць прадстаўнікі правінцый Цзянсу, Хэйлунцзян, Гуйчжоў і Шаньдун, з якімі ў беларускага паўночнага рэгіёна падпісаны пагадненні і мемарандумы аб супрацоўніцтве. Бакі падтрымліваюць кантакты ў навуцы, тэхніцы, гандлі, сферах адукацыі, аховы здароўя, спорту і іншых.

Некаторыя кампаніі правядуць асобныя прэзентацыі. Гасцям прапануюць прадэгуставаць мясную і малочную прадукцыю, кандытарскія вырабы і сухія сняданкі.

Па выніках выставы ў Шанхаі кіраўніцтва паўночнага рэгіёна плануе падпісаць некалькі дагавораў аб супрацоўніцтве з кітайскімі калегамі, у якасці чарговага практычнага кроку будзе падпісаны дакумент аб прамым узаемадзеянні СЭЗ «Віцебск» з эканамічнымі зонамі правінцыі Цзянсі і іх рэзідэнтамі ў мэтах прапрацоўкі пытання стварэння ў Беларусі сумесных вытворчасцяў, выкарыстання беларускімі экспарцёрамі ў КНР механізмаў трансгранічнага гандлю.

## ЛАГІСТЫЧНАЯ АДДАЛЕНАСЦЬ — НЕ ПЕРАШКОДА

Розныя сферы эканомікі Гомельшчыны будуць прадстаўлены на Кітайскай міжнароднай выставе імпарту China International Import Expo. Прадукцыя прадпрыемстваў вобласці размесціцца ў тэматычных павільёнах: «Спажывецкія тавары», «Высокатэхналагічнае абсталяванне і інфармацыйныя тэхналогіі», «Харчовая і сельскагаспадарчая прадукцыя».

У Кітайскай міжнароднай выставе імпарту чарговы раз прадставіць Гомельшчыну адкрытае акцыянернае таварыства «Мілкавіта». Для гэтага — аднаго з найбуйнейшых прадпрыемстваў перапрацоўчай галіны рэгіёна — рынак Кітайскай Народнай Рэспублікі прыярытэтны і на сёння займае другое месца па адгрузках пасля Расійскай Федэрацыі.

— Лагістычная аддаленасць рэгіёна фарміруе адпаведную таварную структуру экспарту. Яе аснова — сухія малочныя прадукты і прадукты з працяглымі тэрмінамі рэалізацыі, — звяртае ўвагу **начальнік аддзела маркетынгу ААТ «Мілкавіта» Аляксандр ДРАЗДОЎ**.

Па яго словах, на выставе будуць фарміравацца прапановы патэнцыяльным кітайскім партнёрам па пастаўках натуральных малочных прадуктаў з Беларусі. Гэта пакетаваныя вадкае малако і вяршкі, масла, сухія малочныя прадукты з палепшанымі характарыстыкамі па растваральнасці і тэмпературнай апрацоўцы.

Між тым, акрамя ААТ «Мілкавіта», у Кітайскай міжнароднай выставе імпарту China International Import Expo Гомельшчыну прадставіць шэраг прадпрыемстваў — флагманаў рэгіёна. Сярод малочных вытворцаў у тым ліку — «Рагачоўскі малочнакансервавы камбінат» і «Тураўскі малочны камбінат». Удзел у выставе пацвердзілі прадпрыемствы «Гомсельмаш», «Гомельскі хімічны завод», «Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод», «СветлагорскХімвалакно», «Светлагорскі цэлюлозна-кардонны камбінат», «Гомельскі тлушчавы камбінат», «Спартак» і іншыя.



Фота з архіва ААТ «Мілкавіта».

У адпаведнасці з канцэпцыяй правядзення Нацыянальнай экспазіцыі Рэспублікі Беларусь на Кітайскай міжнароднай выставе імпарту ў Шанхаі «Дні Гомельскай вобласці» адбудуцца 8 лістапада. Пройдуць прэзентацыі прадукцыі прадпрыемстваў — экспарцёраў рэгіёна і прэзентацыі інвестыцыйных прэферэнцый «СЭЗ «Гомель-Ратон». Падчас мерапрыемства кітайскім партнёрам будзе прадстаўлены не толькі гандлёва-эканамічны, але і турыстычны патэнцыял Гомельшчыны.

За апошнія пяць гадоў тавараабарот Гомельскай вобласці з Кітаем вырас амаль у тры разы, або на 200 мільёнаў долараў. Аснову экспарту складаюць цэлюлоза драўняная, лесаматэрыялы, угнаенні, а таксама харчовая мяса-малочная і кандытарская прадукцыя.

**Матэрыялы падрыхтавалі: Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА, Нэлі ЗІГУЛЯ, Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, Маргарыта УШКЕВІЧ, Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

Па сутнасці

# ГАСПАДАРЫ НА СВАЁЙ ЗЯМЛІ



У прыродзе ўсё заканамерна. За зімой абавязкова прыходзіць вясна. А ці заўжды чалавек ведае, што яго чакае? Жыццё паказвае, што не. А калі гаворка пра грамадства, пра дзяржаву? Чалавек можа толькі планаваць. Вось беларусы спланавалі жыццё сваёй дзяржавы. Падчас І Усебеларускага сходу (на мінулым тыдні якраз было 27 гадоў, як ён адбыўся). Як звычайна кажуць у парадыгме англамоўнага свету, тое быў такі «мазгавы шторм». Але пачакайце, суайчыннікі. Гэта была больш глыбінная падзея. Гістарычная.

Тады мы атрымалі Незалежнасць, а нам прапанавалі яе абмяняць на ўсёдазволенасць. І пакуль бы беларусы хуліганілі ў сваёй хаце, тую хату ды і кавалак зямлі прыбралі б чужынцы ды розныя палітычныя цмокі. Колькі ў гэтую пашчу трапіла іншых краін! Беларусаў выратавалі іх разважлівасць і, мабыць, чысціня розуму, і — галоўнае — сэрца. Кіраўніком абралі чалавека ад зямлі. Свайго. Але сярод нас ужо былі іншыя. Зачараваныя заходнім побытам, а мо і прагай да вялікіх грошай. Зямлю, заводы, сэрцы і нават сумленне — замежным акцыянерам. Вось і пачаўся вэрхал у роднай хаце. Але народ з гэтым не пагадзіўся. Як і два гады да таго, зноў падтрымаў абранага Прэзідэнта. Бо перад вачыма была іншая варыятыўнасць. Страшэнная. Знішчальная. Дзяржаву намагаліся разарваць, а грамадства падзяліць. Не толькі па таўшчыні кашалька — па магчымасцях: атрымаць адукацыю, не выконваць законы, глядзець на суайчыннікаў з пагардай. Гэтага патрабавалі тады нібыта «эліты». Глыбінны народ з гэтым не пагадзіўся. Ні з «прыхватызацыяй» Бацькаўшчыны, ні з «прыхватызацыяй» нашага складу жыцця.

А хто з палітыкаў тады пытаў той народ? Мясцовыя эліты падпарадкоўваліся сусветным уладарам жыцця. Заможным уладарам. А Лукашэнка паклікаў людзей на той сход. У Лукашэнкі была смеласць ісці сваёй дарогай, хапала мудрасці ісці наперад, нібы па сцежцы праз дрыгву. Адкуль толькі былі сілы? Напэўна, ад адчування падтрымкі народа. Тады, на першы Усебеларускі, сабралася талака ў пяць тысяч чалавек — прадстаўнікі ўсіх слаёў насельніцтва, усёй Беларусі. Тады і дамовіліся, як будзем жыць далей. Вось ён — наш грамадскі дагавор. Не, не «паміж уладай і народам». У нас улада і ёсць — народ, яго прадстаўнікі... Але ж былі і тыя, хто супраць. Пакуль дэлегаты сходу шукалі на геапалітычным небасхіле свайго арыенціру — куды рушыць, адны палітычныя цмокі перакульвалі міліцэйскія машыны, іншыя, больш «цывільныя» альбо хітрыя, выношвалі планы «ціхай» барацьбы знянацку. Як кажуць, з-пад ліштвы. І вось тыя «апаненты» і іх справа і цяпер жывыя. Зноў спрабуюць цягнуць Беларусь у прорву. Але народ вызначыў свой шлях ужо тады — на І Усебеларускім сходзе. Так, час змяняецца. Таму патрэбны карэктывы. Але ў нашай палітычнай сістэме ёсць вельмі ўдалы, аўтэнтычны, самастойны інстытут дэмакратыі, улады народа, які ў новай рэдакцыі Канстытуцыі зацверджаны як найвышэйшы орган улады, — Усебеларускі народны сход.

Вельмі важная дэталь — як тады стратэгічна вырашылі, так і робім. Гэта і дазваляе адказваць на ўсе выклікі і пагрозы. Перамога ў 2020-м была не выпадковая, а заканамерная. Так вырашылі беларусы. І вырашылі правільна. Раней мы і марыць не маглі цягацца з заходнімі краінамі. А цяпер мы ў клубе дзяржаў мірнага атама. А наша самабытная, адмысловая галіна — біятэхналогіі. БНБК. Гэта абрэвіятура эканамічнага гонару краіны. Як у свой час «БелАЗ». Савецкую спадчыну мы не толькі зберагі, але і ўзбагацілі. Стварылі сваю сучасную і высокатэхналагічную вытворчасць. А краіны-суседзі, якія вырашылі па-іншаму, што папляліся ў хвасце заходняга следу, на поўначы — увогуле страцілі сваю нацыянальную вытворчасць, на поўдні — губляюць народ. Няўжо цяпер ёсць беларусы, якія не могуць уцяміць, што адбываецца? Пачакаем. Ёсць каму прымаць самыя смелыя і наватарскія рашэнні. Каб Бацькаўшчына была заўжды наша. І гэта відавочна, як тое, што зімовыя чары заўжды знікнуць пры першых гуках абуджальнага покліч журавоў.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

# ЯКАЯ ШКОЛА НА... СМАК?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Згодна з новымі падыходамі ў харчаванні, час прыёму ежы для дзяцей ссунуўся на дзве з паловай гадзіны — так школьнікі паспяваюць прагаладацца і, як вынік, амаль нічога не пакідаюць на талерках. Няглядзячы на тое што пельменямі юных гімназістаў не здзівіць — яны ў школьным меню былі даўно (імі забяспечвае ўстановы адукацыі горада арганізатар школьнага харчавання ААТ «Вітміл»), — пазіцыя «Экзотыка» дагэтуль прыводзіць у захапленне нават самых прыдзірлівых крытыкаў. «Экзотыкай» кухары назвалі курыную катлету пад сырам з ананасамі. З'явіліся ў меню і бульбяная запяканка, і курыныя нагетсы, і бульбяныя долькі — выдатны аналаг амерыканскаму фастфуду. Асабліва даспадобы дзецям блінчыкі з тварожным начыннем і шакаладным соусам, кексы, ёгурты і малочныя express. Супоў у звычайным меню гімназіі няма — так склалася даўно на аснове анкетавання вучняў і іх бацькоў, але для тых, хто на працягу дня захоча паесці гарачанькага, суп можна набыць асобна, яго гатуюць на кухні штодня. Новаўвядзеннем у рамках пілотнага праекта сталі салаты, якія прыйшліся гімназістам даспадобы.

Смятаннікі, смажанкі, школьныя піцы, сасіскі ў цесце, як і разнастайныя напоі, можна набыць на працягу дня дадаткова ў гімназічным буфеце.



Загадчык вытворчасці гімназіі № 1 г. Віцебска Алена АКІМЧАНКАВА.

Свежую выпечку тут гатуюць самі, штосьці з кандытарскіх вырабаў пастаўляе «Вітміл». Але школьнікі не прамінаюць пасля абеду захапіць у буфеце менавіта булачку, бо ведаюць, што калектыў кухараў пад кіраўніцтвам Алены Акімчанкавай заўсёды гатуе смачна, як мама.

«Той факт, што менавіта наша гімназія ўвайшла ў лік устаноў адукацыі вобласці, у якіх праходзіў пілотны праект, не выпадковасць. Вялікая колькасць вучняў і моцная матэрыяльна-тэхнічная база гімназіі дазволілі апрабаваць новыя падыходы ў харчаванні эфектыўна. Дадаткова мы набылі халадзільную камеру на кухню і ў буфет, агароднінарэзку для салатаў, элементы для сервіроўкі сталоў. Рэгулярна сярод школьнікаў і іх бацькоў праводзіцца анкетаванне, па выніках якога пэўныя пазіцыі ў меню змяняюцца. Практыка паказвае, што харчовых адходаў стала значна менш, а гэта значыць, што бюджэтныя сродкі і сродкі бацькоў выкарыстоўваюцца рацыянальна», — адзначае **дырэктар гімназіі Ларыса ЛЯЎКОВІЧ.**

Сваім вопытам ва ўдасканаленні школьнага харчавання гарадская ўстанова адукацыі ахвотна дзеліцца з калегамі з іншых школ, на базе гімназіі праходзіў абласны семінар для спецыялістаў аддзелаў па адукацыі Віцебшчыны, у ходзе якога кіраўніцтва гімназіі дзялілася сваімі напрацоўкамі і арганізоўвала дэгустацыю новых страў для школьнікаў і іх бацькоў.

## Не горш, чым у горадзе

У сельскіх школах таксама пачынаюць арганізоўваць харчаванне навучэнцаў па новых методыках. У ліку тых устаноў адукацыі, якія ўжо маюць пазітыўныя вынікі, — Акцябрская сярэдняя школа Віцебскага раёна імя Героя Савецкага Саюза І. П. Собалева. Установа адукацыі з'яўляецца найбуйнейшай у раёне: сёння ў ёй навучаюцца 480 школьнікаў.

Пачатковая школа, як і паўсюль, атрымлівае гарачае харчаванне па датацыі, вучні 5—11 класаў, якія пражываюць у сельскай мясцовасці, — бясплатны абед. Дзеці з гарадской прапіскай (іх усяго 11 чалавек) у залежнасці ад порцыі плацяць ад 1.60 да 2.70 рубля.

Сярод новаўвядзенняў — прыём ежы пасля дзвюх з паловай гадзін з пачатку заняткаў. Раней усе школьнікі атрымлівалі толькі сняданак, цяпер для вучняў старэйшых класаў гатуюць паўнавартасны абед з супам. Дарэчы, малыя, якія застаюцца на «прадоўжанку», атрымліваюць яшчэ абед і падвячорак. Магчымасць заказваць апошні за дадатковы кошт ёсць і ў старшакласнікаў.

З новым меню, якое хутка ўжо зможа канкурыраваць з гарадскімі кавярнямі, знаёміць **загадчыца сталовай Аксана ГЛАДКІХ.** Высветлілася,



Новае меню каштуюць гімназісты.

што як у вясковых, так і ў гарадскіх дзяцей асаблівай папулярнасцю карыстаюцца курыныя нагетсы і бульбяныя долькі. Замест звычнага кампоту з сухафруктаў цяпер прапануюць двухкаляровы кампот «Фантастык» з двух відаў садавіны, чаму асабліва рада малеча. Мясны асартымент таксама пашырыўся: з'явіліся «гнёзды» са свініны, катлеты «Дуэт» з курыцы і свініны, замест рыбы прыпушчанай — каўбаскі рыбныя «Залацістыя». Сярод хлебабулачных вырабаў лідзіруюць ватрушкі «Беларускія» з сырам. На дэсерт — свежая садавіна, глазураваныя сыркі. «Вельмі важна, што мы не адышлі ад супоў. І, як паказваюць водгукі дзяцей і іх бацькоў, першую страву дзеці ўсё ж такі ядуць ахвотна. У «топе» школьнікаў — боршч, расольнік, малочны суп з грэчкай», — расстаўляе акцэнты Аксана Дзмітрыеўна.

Як расказала **дырэктар школы Юлія ЦЯРЭШЧАНКА,** у праект установа адукацыі ўвайшла без цяжкасцяў: у школы моцная тэхнічная база, нядаўна быў зроблены рамонт, падчас якога значна змянілася і сталовая. Дадаткова было закуплена халадзільнае абсталяванне, у планах — параканвектаматы. «У новы працоўны лад наш калектыў кухараў увайшоў па-баявому, для арганізацыі паўнавартаснага школьнага харчавання кадраў хапае, дапамагаюць і практыканты з мясцовага аграрна-тэхнічнага каледжа. Разам са зменай страў у меню змяніўся іх знешні выгляд, што таксама пазітыўна адбіваецца на ўспрыманні вучнямі. Працэнт харчовых адходаў значна паменшыўся, мы атрымліваем пазітыўныя водгукі ад дзяцей і іх бацькоў. На аснове аналізу харчовых пераваг дзяцей са студзеня плануем увесці ў меню новыя пазіцыі», — адзначае Юлія Анатольеўна.

## Напрыканцы

Нельга не адзначыць эфектыўнасць пілотнага праекта і пазітыўныя вынікі яго ўкаранення. Школа — месца, у якім дзеці праводзяць значны адрэзак жыцця, таму вельмі важна, у якіх умовах яны будуць знаходзіцца. Веды ведамі, а падсілкавацца таксама трэба смачна і ў поўнай меры.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, фота аўтара.**

Спажывец

# САЛОДКІЯ БУДНІ І СВЯТЫ

## На Новы год без цукерак не застанемся

**Навагодні гандаль прысмакамі даўно стаў лакаматывам у продажах для любога кандытарскага прадпрыемства. Менавіта да Новага года вытворцы выпускаюць на рынак новую прадукцыю і нарошчваюць вытворчасць ужо вядомых брэндаў. Немалаважную ролю тут адыгрывае і экспарт.**

### Пра густы не спрачаюцца, але іх «вырошчваюць»

Каля 80 % экспартнай прадукцыі «Камунаркі» прыпадае на Расійскую Федэрацыю, паведаміў **генеральны дырэктар СААТ «Камунарка», член Савета Рэспублікі Сяргей АНЮХОЎСКІ** на прэзентацыі навагодняй калекцыі ад найбуйнейшай кандытарскай фабрыкі краіны.

— Сёлета плануем вырабіць больш за 33 тысячы тон кандытарскіх вырабаў, — агучыў вялікія лічбы Сяргей Анюхоўскі. — Прырост да 2022 года склаў каля 106 %.

Асноўнымі рынкамі збыту выступаюць Расія, Кітай, Казахстан і Узбекістан. Агульная лічба краін, куды ў розным выглядзе — ад іміджавых да пробных партый — пастаўляецца прадукцыя «Камунаркі», налічвае больш за два дзясяткі. Сярод іх — як параўнальна блізкія Латвія і Азербайджан, так і далёкія ЗША. Дарэчы, менавіта ў Амерыку першымі з'язджаюць партыі навагодняй прадукцыі: у канцы жніўня — верасні. Сёлета праз Атлантыку паехалі больш за 20 тысяч навагодніх набораў. Характэрна, што 60 % прысмакаў, якія адпраўляюцца ў Штаты, — любімая і знаёмая не аднаму пакаленню класіка — тыя ж «Сталічныя». Тады як у партыях, якія едуць у Кітай, вялікая доля прыпадае на цукеркі з нестандартным — салодка-салёным або з адчувальнай пярчынкай — смакавым спалучэннем.



Як адзначыў генеральны дырэктар, за апошні год прырост продажаў прадукцыі «Камунаркі» на ўнутраным рынку склаў 112 %, а на экспартным — 103 %, пры гэтым асноўным экспартным спажыўцом з'яўляецца менавіта Расія.

Акрамя таго, Сяргей Анюхоўскі заўважыў, што сёлета з выхадам новага кандытарскага батончыка і высокім попытам на яго фабрыка першай прадставіла беларускую кандытарскую прадукцыю ў асартыменце расійскай сеткі «Красное&Белое» (больш за 16 тысяч магазінаў). «Нашы асноўныя пакупнікі — федэральныя расійскія сеткі, а не маленькія крамы», — заўважыў гендырэктар. Першая заяўка на пастаўку новых батончыкаў склала 75 тон прадукцыі.

### Новая фабрыка са «свежымі» лініямі і грандыёзнымі аб'ёмамі

Цяперашнія магутнасці сталічнай кандытарскай фабрыкі ўжо не дазваляюць нарошчваць вытворчасць у жаданых аб'ёмах, адзначае кіраўнік прадпрыемства.

Першае тэхналагічнае абсталяванне для новай фабрыкі паступіць у канцы 2024 года. Паводле слоў Сяргея Анюхоўскага, да канца бягучага месяца павінен завяршыцца першы тэндар.



«У нас вымалёўваецца тэхналогія пад тое, як мы будзем фабрыку будаваць: якія чэргі будуць першай, другой і трэцяй», — распавёў гендырэктар. Ён адзначыў, што на прадпрыемстве абмяркоўваюць магчымы запуск будаўніцтва адразу трох чэргаў, каб вытворчасць была аптымальнай.

«Зробленае намі павінна застацца на дзесяцігоддзі, каб нічога не перабудоўвалася. Пры праектаванні мы пралічваем мноства варыянтаў. Спрабавалі выбраць аптымальны варыянт», — удакладніў ён.

«У першай палове 2025 года павінны пайсці першыя шакаладныя масы, якія будуць выкарыстаныя і на дзеючай пляцоўцы», — распавёў гендырэктар. Пры гэтым ён растлумачыў, што на новай фабрыцы будуць выпускацца і тыя аб'ёмы прадукцыі, якія цяпер «Камунарка» не можа вырабіць з-за недахопу магутнасцяў. Усяго будзе 10 вытворчых ліній.

Больш за 40 новых відаў прадукцыі выпусціла Камунарка» сёлета, распавяла **начальнік упраўлення па якасці Ганна КОЗЫР.**

— У першую чаргу гэта свайго кшталту тэст-драйв, які займае не менш за паўгода, — падкрэслівае Ганна Козыр. — І толькі пасля яго (і зваротнай сувязі пакупнікоў у тым ліку) навінкі трапляюць у асноўны асартымент. Звычайна гэта 15—20 %. Сёлета ў «Нацыянальную лігу» ўвайшлі 20 кандытарскіх вырабаў.

### На 300 тысяч падарункаў больш

Паўтара мільёна салодкіх навагодніх падарункаў вагой ад 300 грамаў да трох кілаграмаў выпусціць кандытарская фабрыка ў гэтым сезоне. Штогадовы аб'ём такой святочнай прадукцыі вар'іруецца ад 1 200 000 да 1 300 000, але ў гэтым годзе перад калектывам паставілі амбіцыйныя задачы — вырабіць паўтара мільёна падарункаў. Гэта і мініяцюрныя наборы-сувеніры, і вялікія скрынкі з прысмакамі.

На беларускіх прылаўках навагоднія падарункі ад «Камунаркі» з'явяцца ўжо ў трэцяй дэкадзе лістапада.

### Сакрэты шакаладнага «ліцця» і формула 24 на 7

Сталічная кандытарская фабрыка абсталявана па апошнім слове тэхнікі і выпускае сваю салодкую прадукцыю на 18 лініях.

«На прадпрыемстве ўвесь працэс практычна аўтаматызаваны. Устаноўлены сучасныя вытворчыя лініі вядучых сусветных вытворцаў абсталявання. Менавіта гэта дазволіла «Камунарцы» вырасці да выпуску больш за 30 тысяч тон рознай кандытарскай прадукцыі», — паведаміла **начальнік вытворчага аддзела фабрыкі Эма ГЛЯЦЭВІЧ.**

Лінія па выпуску шакаладу з начыннем падобная на бясконцы канвеер, дзе шакалад льецца ў спецыяльныя полікарбанатныя формы. Потым яны праходзяць праз спецыяльны вібрастол — гэта дазваляе раўнамерна размеркаваць салодкую масу па форме.

Дзякуючы вібрацыі з шакаладу сыходзяць бурбалкі паветра. Затым формы ідуць на астуджэнне, а калі маса застыне, спецыяльная машына яе адтуль выбівае. Пасля гэтага плітка пакуецца. На словах усё проста, але за працэсам стаіць наладжаная тэхнолагамі праца.

У Мінску шакалад «льюць» не па класічнай тэхналогіі. У нас у полікарбанатную форму трапляе кропля шакаладу, пасля чаго форма ідзе ў спецыяльную камеру, дзе металічным штампам робіцца адбітак. Так з кроплі фарміруецца шакаладная скарыначка, якую потым можна запоўніць любым начыннем.

Цікава, што штамп спецыяльна астуджаецца да тэмпературы мінус 23 градусы. У камеру паступае падрыхтаванае паветра, каб не выпадала вільгаць з-за змены тэмператур. Вільготнасць у камеры падтрымліваецца на ўзроўні 2—4 % пры тэмпературы 12 градусаў.

Цяпер на фабрыцы ёсць печ, дзе гатуюцца вафельныя лісты, адкуль яны паступаюць на аўтаматызаваную лінію. Прычым у ёй 32 вафельніцы, якім трэба ўсяго дзве хвіліны, каб выпечы нарыхтоўку.

Затым на паўфабрыкат наносіцца начынне і рыхтуецца так званы корпус: папросту кажучы, гэта будучая цукерка, але яшчэ без шакаладнай глазуры. Начынне на вафельны ліст льецца раўнамерна адразу па ўсёй паверхні. Потым зверху падаецца другі ліст вафлі, і атрымліваецца своеасаблівы сэндвіч. Прэс яго ўшчыльняе, а далей яго трэба астудзіць.

Сфармаваныя і астуджаныя блокі наразаюцца струнамі ўздоўж і папярок корпуса. Затым яны ідуць на глазуроўку, дзе на корпус льецца шакаладная маса тэмпературай 28—32 градусы.

Асобная лінія выпускае батончыкі з арэхамі ў масе тофі. Тэхнолаг закладвае ўсе неабходныя складнікі і праграмуе лінію. Затым паўфабрыкаты па спецыяльных трубаправодах падаюцца на лінію размеркавання.

«Сустракаюцца» арэшкі і маса тофі ў спецыяльнай трубе, якая няспынна круціцца, змешваючы ўсё неабходнае для батончыка. Пасля таго як у цыліндрычным змяшальніку адбылося перамешванне, атрыманая салодкая маса ідзе на размеркаванне на шырокую стужку. Яна праходзіць паміж двума барабанамі, якія выпускаюць масу ўжо неабходнай таўшчыні.

Наступны этап — астуджэнне, якое адбываецца на стале, па якім едзе стужка з масай тофі. Затым дыскавыя нажы разразаюць яе на палоскі, потым яны трапляюць яшчэ пад «гільяціну» — і атрымліваецца, як мы ўжо запомнілі, корпус. Гэты корпус застаецца толькі глазураваць, трохі астудзіць, а затым спакаваць. Вось так атрымліваецца арэхавы батончык, пакрыты шакаладам.

Як адзначыла Эма Гляцэвіч, тры асноўныя цэхі на прадпрыемстве працуюць у бесперапынным рэжыме 24 гадзіны ў суткі сем разоў на тыдзень. Гэта значыць, заўсёды, за выключэннем прафілактычнага рамонту на два тыдні ў летні сезон.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Адукацыя

# ДЗЯРЖАЎНЫ ЗАКАЗ НА ІНЖЫНЕРНЫЯ КАДРЫ

**Ва ўмовах сур'ёзнага санкцыйнага ціску падрыхтоўка інжынерных кадраў для высокатэхналагічных галін эканомікі з'яўляецца найважнейшым складнікам тэхналагічнага суверэнітэту кожнай краіны. Гэта думка рэфрэнам гучала ў словах усіх удзельнікаў XII форуму ВНУ інжынерна-тэхналагічнага профілю Саюзнай дзяржавы, які праходзіць гэтымі днямі ў Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце. На яго пляцоўках сабраліся прадстаўнікі каля 40 універсітэтаў з Расійскай Федэрацыі і Узбекістана: кіраўнікі, студэнты, аспіранты, маладыя навукоўцы, прадстаўнікі стартапаў...**

— У Беларусі падрыхтоўку інжынерных кадраў праводзіць каля дзясятка ВНУ. Штогадовы набор на інжынерныя спецыяльнасці складае больш як 17 тысяч чалавек, — праінфармаваў гасцей **міністр адукацыі нашай краіны Андрэй ІВАНЕЦ.** — Хацеў бы адзначыць, што падрыхтоўка высакакласных спецыялістаў у першую чаргу забяспечваецца за кошт рэалізацыі падыходаў гібрыднай адукацыі: школа — універсітэт — прадпрыемства. Каля чатырох тысяч спецыялістаў, якія працуюць у рэальным сектары эканомікі, прымаюць непасрэдны ўдзел у адукацыйным працэсе і ў падрыхтоўцы інжынерных кадраў. Для павышэння матывацыі нашых навучэнцаў да выбару інжынерных прафесій прымаецца цэлы комплекс мер. Дзейнічае Нацыянальны дзіцячы тэхнапарк, дзе рэалізоўваюцца праграмы падрыхтоўкі будучых інжынераў. Іх выпускнікі могуць без экзаменаў паступаць у нашы ўніверсітэты. З гэтага года ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі адкрыліся інжынерныя класы, дзе навучаюцца больш як 2,5 тысячы нашых школьнікаў. Мы плануем ствараць умовы, каб іх паспяховыя выпускнікі маглі без экзаменаў паступаць на інжынерныя спецыяльнасці.

Андрэй Іванец адзначыў, што сёння на парадку дня стаіць пытанне больш цеснай кааперацыі ўстаноў вышэйшай адукацыі дзвюх краін. «Падрыхтоўка інжынерных кадраў можа праводзіцца ў сеткавай форме ўзаемадзеяння, каб у поўнай ступені выкарыстоўваць патэнцыял вядучых беларускіх і расійскіх ВНУ. Мы гатовы сёння рыхтаваць тых спецыялістаў, якія важныя для нашай эканомікі, і выконваць фактычна дзяржаўны заказ. Адукацыя — не проста атрыманне той ці іншай спецыяльнасці або кваліфікацыі, а падрыхтоўка высакакласнага спецыяліста пад канкрэтнае высокатэхналагічнае прадпрыемства», — падкрэсліў міністр адукацыі.

Андрэй Іванец паведаміў, што вельмі важную ініцыятыву агучыў Пастаянны камітэт Саюзнай дзяржавы — аб стварэнні Беларуска-Расійскага ўніверсітэта высокіх тэхналогій. «Мы яе падтрымаем, — паабяцаў ён. — Упэўнены, што рэалізацыя дадзенай ініцыятывы ў сеткавай форме ўзаемадзеяння вядучых беларускіх і расійскіх ВНУ дазволіць нам падрыхтаваць насамрэч высакакласнага інжынера».

Як прыклад паспяховага ўзаемадзеяння Андрэй Іванец прывёў праект «Перадавыя інжынерныя школы», які рэалізоўваецца БНТУ і Пскоўскім дзяржаўным універсітэтам. У яго рамках праводзіцца падрыхтоўка міжгаліновага інжынера. А вось патэнцыял Беларуска-Расійскага ўніверсітэта, на яго думку, раскрыты яшчэ не поўнасцю.

— XII форум ВНУ інжынерна-тэхнічнага профілю сабраў вельмі аўтарытэтны састаў. Гэта яшчэ раз пацвярджае запатрабаванасць інжынернай навукі і навуковых кадраў на новым этапе. Устойлівасць вытворчага і навукова-тэхналагічнага патэнцыялу Расіі і Беларусі дазваляе нам годна спраўляцца з сённяшнімі выклікамі і фарміраваць адзіную прамысловую палітыку, якая звернутая ў заўтрашні дзень, — падкрэсліў у сваім выступленні **дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі Дзмітрый МЕЗЕНЦАЎ.**

Ён нагадаў, што ў нядаўнім мінулым прэзідэнты Расіі і Беларусі Уладзімір Пуцін і Аляксандр Лукашэнка зацвердзілі 28 саюзных праграм (дарожных карт інтэграцыі). Адна з ключавых мае на ўвазе стварэнне адзінай прамысловай палітыкі.

«Гэта немагчыма зрабіць без уключанасці тысяч маладых грамадзян Расіі і Беларусі, якія маюць добрую, якасную, сучасную адукацыю», — падкрэсліў дзяржсакратар.

Ён таксама звярнуў увагу, што прэм'ер-міністр Расіі, старшыня Саўміна Саюзнай дзяржавы Міхаіл Мішусцін падпісаў важны дакумент — саюзную стратэгію навукова-тэхнічнага развіцця да 2035 года.

**Пасол Расійскай Федэрацыі ў Беларусі Барыс ГРЫЗЛОЎ** лічыць недапрацоўкай тую акалічнасць, што ў Беларусі дзейнічаюць усяго два філіялы расійскіх ВНУ: «Ёсць стратэгічная лінія ў нашай Саюзнай дзяржаве — гэта забеспячэнне роўных правоў для грамадзян, якія пражываюць у Расіі і ў Беларусі. У тым ліку, безумоўна, гэта роўныя правы на атрыманне годнай адукацыі. Расія дае магчымасць беларускім студэнтам навучацца ў рамках урадавай квоты — гэта бясплатнае навучанне. На бягучы год было выдзелена 1,3 тысячы месцаў. Таксама вучацца і расіяне ў беларускіх ВНУ».

Пасол адзначыў, што ва Узбекістане працуюць 13 філіялаў расійскіх ВНУ, у Казахстане — восем, у Арменіі — шэсць, а ў Беларусі — толькі два. «У Саюзнай дзяржаве трэба выправіць гэты недахоп. Ёсць тыя ВНУ, якія хацелі б стварыць тут свае філіялы. І гэта было б абсалютна правільна. У беларускіх абітурыентаў папулярнасцю карыстаюцца такія расійскія ВНУ, як Санкт-Пецярбургскі політэхнічны ўніверсітэт, ён знаходзіцца на першым месцы па пажаданнях. Таксама паступаюць беларусы ў Інстытут дакладнай механікі і оптыкі, у Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны электратэхнічны ўніверсітэт», — канстатаваў ён.

Барыс Грызлоў падкрэсліў, што ў Беларусі створана атамная галіна. А ў Расіі ёсць інстытут МІФІ, які рыхтуе спецыялістаў-ядзершчыкаў. «Мяркую, што туды павінны паступаць і беларускія абітурыенты для таго, каб атамная галіна была менавіта беларускай. Так што ў нас вельмі шмат пытанняў, якія мы хацелі б абмеркаваць у рамках XXII форуму ВНУ інжынерна-тэхналагічнага профілю», — дадаў пасол.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Імпартазамяшчэнне

# Кааперацыя па-магілёўску

## Тут праходзіць міжнародны форум «Зроблена ў Расіі» — «Зроблена ў Беларусі»

**На тры дні, з 25 да 27 кастрычніка, абласны цэнтр пераўтварыўся ў бізнес-пляцоўку для перагавораў паміж прадстаўнікамі дзелавых колаў. Свае стэнды і ўзоры прадукцыі на прасторных плошчах СК «Алімпіец» прадставілі вытворцы з Аранбургскай, Смаленскай, Курскай, Наўгародскай і іншых абласцей. Болей чым 100 прадстаўнікоў бізнесу з 14 расійскіх рэгіёнаў далі згоду на ўдзел у магілёўскім форуме. У адкрыцці мерапрыемства прынялі ўдзел старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА, гандлёвы прадстаўнік Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь Юрый ЗАЛАТАРОЎ, намеснік міністра эканомікі Рэспублікі Беларусь Уладзімір НАУМОВІЧ.**

Магілёў сёння жыве ў дынамічным дзелавым рытме. Тут актыўна вядуцца перагаворы ў фармаце B2B, адбываюцца дзелавыя сустрэчы, тэматычныя дыскусіі, прэзентацыйныя выставы экспартна-арыентаваных прадпрыемстваў. Усё гэта накіравана на развіццё гандлю і эканамічнага партнёрства, вызначэнне новых бізнес-партнёраў на знешнім рынку, пошук альтэрнатыўных пастаўшчыкоў прадукцыі (сыравіны, абсталявання, камплектуючых) для кампаній-экспарцёраў, устанаўленне кааперацыйных сувязяў, а таксама фарміраванне новых каналаў экспарту і імпарту прадукцыі.

— Галоўная задача форуму — прэзентаваць магчымасці беларускіх прадпрыемстваў, абмяняцца практычным вопытам і знайсці новыя рашэнні ў агульным з расіянамі імпартазамяшчэнні, — абазначыў падчас адкрыцця губернатар Магілёўскай вобласці Анатоль Ісачанка. — Расія застаецца адным з нашых найважнейшых партнёраў, таму на першы план выходзяць не проста пытанні павялічэння тавараабароту, а павелічэнне ўзаемнай кааперацыі для сыходу ад імпарту і стварэння новых канкурэнтаздольных тавараў для рэалізацыі на ўнутраным і знешнім рынках. Неабходна максімальна ўмацоўваць міжрэгіянальныя адносіны і развіваць транспартна-лагістычныя калідоры.

На форуме працуюць тры секцыі: «Прамысловая кааперацыя — шлях ад імпартазамяшчэння да тэхналагічнай незалежнасці», «Экспарт ва ўмовах санкцый. Інструменты падтрымкі экспарту» і «Продажы на маркетплэйсах. Як працаваць на маркетплэйсах».

Азнаёміцца з дасягненнямі беларускага аўтапрама можна на пляцоўцы каля спартыўнага комплексу.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ДОБРЫХ ДАРОГ СТАНЕ БОЛЬШ

## У наступным годзе ў нашай краіне іх адрамантуюць больш за чатыры тысячы кіламетраў

**Пра гэта заявіў міністр транспарту і камунікацый Аляксей ЛЯХНОВІЧ. Ён, у прыватнасці, адзначыў, што айчынным дарожнікам было вельмі складана выходзіць з зімы — такая максімальная ямачнасць была на дарогах.**

«Перш за ўсё трэба было ліквідаваць гэтую ямачнасць, на найбольш складаных участках зрабіць бягучы рамонт без шкоды планам па рэканструкцыі. І з гэтым мы таксама спраўляемся. Сёлета выдзелена 1,4 мільярда рублёў на рэканструкцыю і рамонт усёй дарожнай сеткі — гэта датычыцца і рэспубліканскіх, і мясцовых дарог. Плануем зрабіць каля трох тысяч кіламетраў дарог, гэта значыць, правесці мадэрнізацыю, удасканаленне пакрыццяў, каб дарога магла адслужыць яшчэ 7-8 гадоў.

Што датычыцца наступнага года, вельмі сур'ёзная сума сродкаў прадугледжана на дарогі, менавіта на ўдасканаленне пакрыццяў, — амаль 2,2 мільярда рублёў. За гэтыя сродкі мы зробім больш за чатыры тысячы кіламетраў дарог», — сказаў Аляксей Ляхновіч.

Паводле яго, у Беларусі зменены вектар работ. «Раней мы часцей ездзілі ў Еўропу, а цяпер з'явілася патрэба ў новым калідоры на Санкт-Пецярбург. Гаворка ідзе пра аўтадарогу Р46 Лепель — Полацк — граніца Расійскай Федэрацыі. Сёлета мы прыступілі да рэканструкцыі ад Полацка да Лепеля. Акрамя гэтага, ад Полацка да граніцы РФ пачаты капітальны рамонт гэтай дарогі, завяршыць які плануем у 2024 годзе з павелічэннем нагрузкі на вось», — дадаў міністр.

Ён адзначыў, што інфраструктурныя праекты выконваюцца, нягледзячы на спыненне заходняга фінансавання. «Для нас нічога не змянілася. Цяпер гэта грошы не міжнародных арганізацый, а нашы, бюджэтныя, грошы. Напрыклад, з ЕБРР быў праект па 13 маставых збудаваннях, але з сыходам Еўрапейскага банка мы не спыніліся. І працягнулі іх рэканструкцыю. Увялі ўжо чатыры масты, сёлета ўводзім яшчэ пяць, у наступным годзе плануем астатнія чатыры завяршыць», — праінфармаваў Аляксей Ляхновіч.

### ВІЗІТНАЯ КАРТКА КРАІНЫ

Сёння ў Беларусі налічваецца каля 16 тысяч кіламетраў рэспубліканскіх дарог і 70 тысяч кіламетраў дарог мясцовага прызначэння.

А наогул, тэма дарог і транспартных стасункаў ужо некалькі гадоў запар у топе зваротаў грамадзян па ўсёй краіне. Ад якасці дарожнага пакрыцця напрамую залежаць камфорт кіроўцаў і пасажыраў, бяспека руху і транспартныя выдаткі перавозчыкаў. Дарогі — гэта візітная картка краіны. Працягласць аўтамабільнай сеткі агульнага карыстання ў Беларусі складае больш за 87 тысяч кіламетраў. Каб яны былі бяспечныя і камфортныя, кожны год праходзіць дыягностыка.

Сёлета на рамонт і рэканструкцыю аўтамабільных дарог агульнага карыстання першапачаткова было прадугледжана 1,27 мільярда рублёў, што складае 136,5 % да ўзроўню 2022 года. Такое фінансаванне дазволіць адрамантаваць каля 2,5 тысячы кіламетраў дарог і 4 тысячы пагонных метраў маставых збудаванняў, паведамілі ў галоўным упраўленні аўтамабільных дарог Міністэрства транспарту і камунікацый.

Паводле слоў спецыялістаў, цяпер ідуць работы па прывядзенні ў нарматыўны стан участкаў на М-1/Е30 Брэст (Казловічы) — Мінск — граніца Расійскай Федэрацыі (Рэдзькі), М-3 Мінск — Віцебск, Р-1 Мінск — Дзяржынск, Р-46 Лепель — Полацк — граніца Расійскай Федэрацыі (Юхавічы), Р-53 Слабада — Навасады і шэрагу іншых. Па выніках дыягностыкі і сезонных аглядаў усяго неабходна адрамантаваць сем тысяч 233 кіламетраў рэспубліканскіх аўтамабільных дарог і 14 тысяч 625 кіламетраў мясцовых дарог. Без уліку запланаваных аб'ёмаў рамонту яшчэ больш за 7 тысяч кіламетраў аўтадарог агульнага карыстання патрабуюць першачарговага аднаўлення: 1,9 тысячы кіламетраў рэспубліканскіх і 5,5 тысячы кіламетраў мясцовых.

Звесткі аб усіх участках дарог як рэспубліканскага, так і мясцовага значэння, якія падлягаюць рамонту, ужо цяпер алічбаваны і ўключаны ў адпаведныя пералікі задач. Акрамя таго, на рэспубліканскіх дарогах не адпавядаюць нарматывам па грузападымальнасці або габарыце 909 маставых збудаванняў (40,1 %), па мясцовых дарогах — 1236 мастоў (41,4 %).

У канцы лета быў зацверджаны перспектыўны план работ на 2022—2025 гады па капітальным рамонце (рэканструкцыі, мадэрнізацыі) мастоў і пуцеправодаў, размешчаных на рэспубліканскіх і мясцовых аўтамабільных дарогах. Ёсць канкрэтны пералік збудаванняў, арыенціровачны кошт работ і тэрміны. Згодна з гэтым планам, прадугледжаны рэканструкцыя і капітальны рамонт 156 мастоў на рэспубліканскіх і 182 мастоў на мясцовых дарогах.

Па даручэнні ўрада ў кастрычніку была выканана карэкціроўка Дзяржаўнай праграмы «Дарогі Беларусі» на 2021—2025 гады з улікам новых эканамічных умоў і прыярытэтных кірункаў развіцця сектараў эканомікі. Былі павялічаны аб'ёмы рамонту аўтадарог агульнага карыстання ў 2024—2025 гадах для прывядзення сеткі ў належны стан. Выдзеленыя дадатковыя фінансавыя сродкі дазволяць знізіць колькасць участкаў дарог і мастоў, якія патрабуюць неадкладнага аднаўлення.

### ПАВІННА ПРАЙСЦІ ПРАВЕРКУ НА ТРЫВАЛАСЦЬ

Дыягнастуюць дарожнае пакрыццё з дапамогай спецыяльнай машыны з прафілографам. У такім аўтамабілі ўстаноўлены лазерныя датчыкі, якія скануюць паверхню дарогі і затым праз спецыяльную праграму выдаюць індэкс роўнасці IRI (сума вертыкальных ваганняў аўто).

Работнікам «Белдарцэнтра», у якіх ёсць такія спецыяльныя машыны, часцяком даводзіцца выязджаць на аб'екты і рабіць адбор пробы матэрыялаў, якія потым адпраўляюць у лабараторыю прадпрыемства. Там такую пробу правяраюць на прэсе, пасля чаго даюць заключэнне, ці дасягнуў матэрыял праектнай трываласці. Таксама ў лабараторыі даследуюць дарожную разметку: ці выкананы тэхналогіі пры нанясенні. Пасля дыягностыкі РУП «Белдарцэнтр» выдае рэкамендацыі ўладальніку магістралі. Але не заўсёды гэтых рэкамендацый прытрымліваюцца — часам з-за недастатковага фінансавання даводзіцца капітальны рамонт замяняць ямачным.

На думку кіраўніцтва РУП «Белдарцэнтр», вырашыць праблему дрэнных дарог можа пераход на цэментабетонныя дарогі.

Вялікая дарожная будоўля разгарнулася на рэспубліканскай трасе М-3 Мінск — Віцебск паміж Лагойскам і Плешчаніцамі. Па праекце гэты 15-кіламетровы ўчастак стане шырэйшы: будзе чатыры паласы, а замест асфальту пакладуць бетон. Тэрмін будаўніцтва — чэрвень 2023 — снежань 2024. За апошнія сем гадоў у Беларусі было ўзведзена і рэканструявана 176 кіламетраў рэспубліканскіх аўтадарог з цэментабетонным пакрыццём. Вяртанне да маштабнага будаўніцтва бетонных магістраляў — адно з даручэнняў Прэзідэнта краіны.

**Сяргей КУРКАЧ.**

---

ГОСУДАРСТВЕННОЕ ПРЕДПРИЯТИЕ БЕЛГИПРОДОР

# ПРАЕКТУЮЧЫ БУДУЧЫНЮ



Аўтамабільная дарога М-3 Мінск — Віцебск.

## ДП «Белдзіпрадар» спраектавала тысячы мастоў і дзясяткі тысяч кіламетраў дарог у нашай краіне і за яе межамі

**МАДЭРНІЗАЦЫЯ транспартных артэрый Беларусі да ўзроўню сучасных еўрапейскіх стандартаў праводзіцца па праектах унікальнага беларускага прадпрыемства з амаль стагадовай гісторыяй — ДП «Белдзіпрадар».**

Прадпрыемства напрацавала вялікі вопыт праектавання мастоў і дарог, у тым ліку самых складаных сучасных збудаванняў са шматузроўневымі транспартнымі развязкамі, пешаходнымі пераходамі на розных узроўнях і дарожнай інфраструктурай.

**Паважаныя сябры і калегі!**

**Ад усёй душы віншую вас са святам аўтамабіліста і дарожніка.**

***Я ўдзячны ўсім супрацоўнікам нашага прадпрыемства за прафесіяналізм і вернасць прафесіі. Жадаю, каб праца прыносіла вам толькі радасць і задавальненне, а яе вынікі былі запатрабаваныя і карысныя людзям. Здароўя вашым блізкім і дабрабыту вашым сем'ям. Няхай наш наступны прафесійны год будзе плённы і паспяховы.***



**Дырэктар дзяржаўнага прадпрыемства «Белдзіпрадар» Ігар ДАВЫДАЎ.**

### На пачатку ўсіх дарог



Любой праекціровачнай рабоце папярэднічаюць вымярэнні на мясцовасці і разлікі.

— У працы — цэлы шэраг праектаў, — распавядае **намеснік начальніка ўпраўлення інжынерных пошукаў Аляксей ЕРМАЧОНАК.** — Гэта, у прыватнасці, рэканструкцыя аўтамабільнай дарогі М-8 (участак ад Віцебска да Оршы), а таксама трасы Р-122 (першая чарга — ад Магілёва да Чавусаў). Важны кірунак працы — маштабная рэканструкцыя мастоў па ўсёй Беларусі (напрыклад, маставыя збудаванні ў Гомелі, масты праз раку Сож у Ветцы і Калінкавічах, мост праз Прыпяць). Усе гэтыя аб'екты былі пабудаваны яшчэ ў савецкія часы. Цяпер вядзецца іх рэканструкцыя, і мы рабілі пошукі пад гэтыя праекты. Некалькімі пакаленнямі спецыялістаў ДП «Белдзіпрадар» спраектавана больш за 40 000 кіламетраў аўтадарог і тысячы мастоў у нашай краіне, суседняй Расіі (уключаючы рэгіёны са складанымі ўмовамі — Комі і Заходнюю Сібір, Башкартастан), Казахстане, краінах Прыбалтыкі. І сёння гэты вопыт спатрэбіўся для работы над праектам у Краснадарскім краі.

— Значны для нашага прадпрыемства аб'ект — абыход Новарасійска, — распавядае Аляксей Уладзіміравіч. — Шматкіламетровая траса пройдзе па горнай мясцовасці. Для нас гэта новая задача, але мы валодаем сучаснымі тэхналогіямі для інжынерных пошукаў. Перакананы, і іншыя этапы работы будуць выкананы якасна. На дадзены момант завершаны першы этап: палявыя вымярэнні, тапаграфічная здымка. Цяпер вядуцца камеральныя работы і стварэнне 3D-мадэлі мясцовасці.

У Новарасійску больш за 20 кіламетраў сучаснай хуткаснай трасы праляжа па мясцовасці з перасечаным рэльефам, дзе перапады вышынь на невялікім працягу часам дасягаюць да 200 метраў, расказаў спецыяліст. Мясцовасць складаная, таму падыходзіць да інструментальнай здымкі прыйшлося комплексна, выкарыстоўваючы розныя метады вымярэнняў і рознае абсталяванне.

### Час будаваць абыходы і кальцавыя



Для стварэння сучасных дарог ужо недастаткова толькі якаснага дарожнага палатна — з'явілася неабходнасць прыўносіць інавацыйныя рашэнні і перадавы вопыт, падкрэсліваюць у ДП «Белдзіпрадар».

Прыкмета часу сёння — будаўніцтва абыходаў і кальцавых вакол гарадоў. Вонкавы радыус — разгрузка ад транзітных аўто, ён дазваляе гасцям заехаць у патрэбны раён, а жыхарам — без затораў патрапіць з адной часткі горада ў іншую.

— У найбліжэйшых планах — будаўніцтва абыходу Полацка, а ў перспектыве — і Гомеля, — распавядае **начальнік упраўлення дарожнага праектавання Валянцін ІВАНОЎ.** — Будаўніцтва кальцавой вакол Магілёва таксама вялося па нашым праекце, гэта другая кальцавая ў краіне пасля МКАД. А летась па нашым праекце пабудаваны абыход горада Міра. Гэта значны для рэгіёна аб'ект, ён разгрузіў горад ад турыстаў, ды і гасцям прасцей заехаць у турыстычныя месцы.

— Працягваецца праектаванне аўтадарогі М-8, участак Віцебск — Орша будзе пашыраны да чатырох палос, — распавядае Валянцін Пятровіч. — Яшчэ адзін важны аб'ект — траса М-3 Мінск — Віцебск, участак ад Лагойска да Плешчаніц (каля 30 кіламетраў). Участак загружаны, і пашырэнне дарогі да ўзроўню 1-й катэгорыі тут літаральна прадыктавана жыццём. Праект ужо прайшоў экспертызу, распачата будаўніцтва. Сярод нядаўніх праектаў — участак аўтадарогі Р-53 ад Смалявіч да Жодзіна. Што да найбліжэйшых перспектыў, гэта рэканструкцыя аўтадарогі М-10, участак ад Гомеля да Калінкавічаў.



### Камфорт вадзіцеляў і пасажыраў



Адзін з буйных праектаў, якія ДП «Белдзіпрадар» рэалізоўвае сумесна з РУП «Белмытсэрвіс», — праектаванне і інжынернае суправаджэнне будаўніцтва зон чакання на граніцах краіны з арганізацыяй чаргі для праезду праз мытныя органы за тэрыторыю Беларусі. Зона чакання — гэта свайго кшталту транспартны хаб, вузел, дзе сканцэнтравана ўся неабходная інфраструктура, тлумачыць **начальнік упраўлення праектавання прамысловых і грамадзянскіх збудаванняў Аляксандр НАВУМОВІЧ.** Яна ўключае ў сябе стаянку для грузавога, легкавога транспарту і турыстычных аўтобусаў, а таксама шматфункцыянальны комплекс з шэрагам сэрвісаў. Перавага зоны чакання — сістэма электроннай чаргі: яна рэгіструе нумар аўтамабіля з дапамогай камеры відэаназірання, і, калі падыходзіць чарга, нумар высвечваецца на экране табло.

— Сёння мы займаемся праектаваннем такіх аб'ектаў на граніцах з Польшчай і Літвой, — адзначае Аляксандр Віктаравіч. — Адзін з аб'ектаў — уласна зона чакання, а другі (пераход Грыгораўшчына) сумяшчае зону чакання і транспартна-лагістычны цэнтр.

На плошчы 18 гектараў размесціцца паркоўка на больш чым 700 грузавых машына-месцаў з інтэлектуальнай сістэмай асвятлення, сістэмай відэаназірання і кантролю доступу, а таксама цэлы «горад» з будынкамі прыдарожнага сэрвісу, крамамі, душавымі, кругласутачным кафэ.

### У прыярытэце — экалогія




Любы аб'ект — аўтатраса, мост або зона чакання на мяжы — «нараджаецца» з прычыны неабходнасці, прадыктаванай жыццём. Іншымі словамі, патрэбна абгрунтаванне інвестыцый: ацэнка важнасці будаўніцтва дадзенага аб'екта з эканамічнага пункту гледжання, падкрэслівае **начальнік аддзела тэхніка-эканамічных і экалагічных абгрунтаванняў Ігар ФРАНСКЕВІЧ.** Зыходзячы з гэтай ацэнкі, прымаецца рашэнне аб параметрах будучай дарогі.

Пытанні экалогіі пры праектаванні любога аб'екта — таксама ў прыярытэце для калектыву «Белдзіпрадар». Экалагічная экспертыза выяўляе нюансы, якія могуць абмежаваць праектныя рашэнні або запатрабаваць дадатковай дарожнай інфраструктуры: напрыклад, калі траса пралягае на шляху міграцыі жывёл або ў ахоўных зонах, дзе пражываюць або растуць «чырванакніжнікі».

### Злучаючы берагі



Многія праекты ДП «Белдзіпрадар» можа выканаць толькі інжынернае прадпрыемства з допускам першай катэгорыі складанасці. У прыватнасці, гэта масты вялікай працягласці: работы, да таго ж, патрабуюць сціслых тэрмінаў у адпаведнасці з Праграмай рэканструкцыі першачарговых мастоў і пуцеправодаў, зацверджанай Урадам Рэспублікі Беларусь.

— Адзін з найважнейшых праектаў — мост праз раку Бярэзіну ў Бабруйску, сталёва-жалезабетоннае збудаванне вялікай працягласці (больш за 400 м), — адзначае **галоўны інжынер праектаў упраўлення маставога праектавання № 2 Дзмітрый БУЛВА.** — Мост знаходзіцца ў перадаварыйным стане, а гэта адна з цэнтральных артэрый горада. Складаных інжынерных рашэнняў патрабуе і дэмантаж існуючай пралётнай будовы. Важна захаваць апоры, на якіх у далейшым будзе ўладкоўвацца новая пралётная пабудова са сталі і жалезабетону. Таксама ў рабоце — мост праз Прыпяць працягласцю каля паўкіламетра, адзін з найбуйнейшых у Беларусі.

Яшчэ адно маставое збудаванне, якое цяпер у экспертызе, — мост праз Днепр каля Рэчыцы, распавядае суразмоўца.

— Мост пабудаваны ў савецкія гады, яго асаблівасць — неразразная сталёвая ферма. Такіх мастоў у нашай краіне ўсяго два. Мы вырашылі аддаць даніну праекціроўшчыкам мінулага і паўтарылі форму рэчышчавай пралётнай пабудовы, — распавядае Дзмітрый Міхайлавіч.

Упрыгожаннем Беларусі стане мост праз Прыпяць у Мазыры. Апроч праезнай часткі, ён уключае пешаходную зону, назіральныя пляцоўкі і сходы да вады.

### Якасць і бяспека

ДП «Белдзіпрадар» — найбуйнейшая праектная арганізацыя не толькі ў нашай краіне, але і ў краінах СНД. У год спецыялісты прадпрыемства праектуюць больш за 135 кіламетраў аўтадарог, а агульная працягласць запраектаваных па рэканструкцыі за апошнія гады аўтадарог I і II катэгорыі складае больш за 400 кіламетраў, распавядае **дырэктар ДП «Белдзіпрадар» Ігар ДАВЫДАЎ.** За апошнія тры гады спраектавана каля чатырох дзясяткаў мастоў і пуцеправодаў, у тым ліку больш за 15 — вялікай працягласці. Здаецца, што праектаванне аўтатрас і мастоў — занятак выключна мужчынскі, але калектыў прадпрыемства на дзве трэці — жаночы, адзначае Ігар Эдуардавіч. І менавіта жаночая ўседлівасць і адказнасць вызначаюць славутую якасць беларускіх дарог, якія па праве лічацца самымі бяспечнымі ва Усходняй Еўропе.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ, Алена ДАЎЖАНОК.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА і з архіва прадпрыемства.**

УНП 100230496

# У ПРЫЯРЫТЭЦЕ — ЯКАСЦЬ І БЯСПЕКА РУХУ

## Прадпрыемства «Гроднааблдарбуд» датэрмінова завяршае выкананне гадавога задання дзяржаўнай праграмы «Дарогі Беларусі»



**АПОШНІМ часам увага да стану дарог у Беларусі значна вырасла. На неабходнасць паляпшэння дарожнага палатна, у прыватнасці, мясцовых дарог, звярнуў увагу Прэзідэнт падчас рабочай паездкі ў Гродзенскую вобласць вясной гэтага года. Перад урадам была пастаўлена задача за 2023 год прывесці ўсе дарогі ў парадак. Пастаўленыя перад гродзенцамі заданні паспяхова выконваюцца. Работа КУП «Гроднааблдарбуд» пад кіраўніцтвам Сяргея СЛІНКО вядзецца з апярэджваннем графіка.**

**Сяргей Слінко на пасадзе генеральнага дырэктара прадпрыемства працуе зусім нядаўна. Родам з Баранавіч Брэсцкай вобласці, скончыў Беларускую дзяржаўную політэхнічную акадэмію (цяпер БНТУ) па спецыяльнасці «Аўтамабільныя дарогі і транспартныя аб'екты». Пасля заканчэння быў размеркаваны ў Брэст, затым перавёўся ў Гродна. Тут пачаў работу майстрам дарожнага ўпраўлення, затым стаў галоўным інжынерам. З верасня 2023 года — кіраўнік абласнога дарожнага прадпрыемства Беларусі. Яго працоўнае крэда — кантроль і якасць.**

— На балансе прадпрыемства «Гроднааблдарбуд» — 10,5 тысячы кіламетраў дарог. У кожным раёне ад 500 да 800 кіламетраў участкаў, якім патрэбны догляд і рамонт. Каб работа вялася якасна, неабходны кантроль, таму іншы раз за дзень даводзіцца аб'ехаць некалькі раёнаў. Прыярытэт тут адзін — бяспечны рух транспарту на дарогах. Таму ў першую чаргу звяртаем увагу на самыя аварыйныя ўчасткі. Участкі рамонту ўзгадняюцца з мясцовымі органамі ўлады.

Работа вядзецца ў рамках дзяржаўнай праграмы «Дарогі Беларусі», якая разлічана на 2021—2025 гады. У адпаведнасці з задачамі праграмы, у бягучым годзе павінны былі адрамантаваць 169 кіламетраў аўтамабільных дарог і 133 метры пагонных мастоў. Усё неабходнае фінансаванне праводзіцца, таму ніякіх перашкод у выкананні гэтых планаў няма. Па стане на першага кастрычніка адрамантавана 207 кіламетраў дарог і 153 метры пагонных мастоў. Больш за тое, мяркуем дадаткова атрымаць 6 мільёнаў рублёў бюджэтных сродкаў. Гэта дасць магчымасць павялічыць працягласць адрамантаванага дарожнага палатна да 240 кіламетраў, што значна больш за планавае заданне.



Генеральны дырэктар Сяргей СЛІНКО.

Дадатковае фінансаванне выдзелена дзякуючы ўвазе Прэзідэнта да гэтай праблемы. Думаю, нашых магутнасцяў хопіць для таго, каб засвоіць гэтыя сродкі. У вобласці працуе 14 асфальтных заводаў, практычна ў кожным раёне ёсць такая вытворчасць. Таксама выпускаем бетонныя вырабы, дарожныя знакі, аўтапавільёны, лаўкі.

Калі гаварыць пра рамонт мастоў, трэба адзначыць мост праз раку Нёман у гарадскім пасёлку Любча Навагрудскага раёна. Гэта даволі складаны аб'ект, працягласцю 250 пагонных метраў з 12 пралётамі. Тут вядзецца капітальны рамонт, кошт якога складае каля трох мільёнаў рублёў. Работы падыходзяць да завяршэння, зроблена больш за 80 % усяго аб'ёму. Мост будзе ўведзены да канца года і завершыць планавыя заданні па рамонце дадзеных аб'ектаў. Усяго, згодна з праграмай, адноўлена шэсць маставых збудаванняў вобласці.

На прадпрыемстве працуюць каля 1400 дарожнікаў. Для работнікаў прадугледжаны значны сацыяльны пакет. У прыватнасці, адначасовая дапамога выплачваецца маладому спецыялісту, яму выдзяляецца жыллё альбо выплачваецца кампенсацыя па найме. Робім выплаты падчас знакавых падзей — вяселля, нараджэння дзіцяці. Маладыя спецыялісты не застаюцца самнасам са сваімі бытавымі ці вытворчымі праблемамі.

Дарэчы, у краіне некалькі ВНУ, якія выпускаюць спецыялістаў дарожнай службы. Найбольш перспектыўным у пастаўцы кадраў з'яўляецца наш Гродзенскі політэхнічны каледж. Штогод забіраем 30—40 чалавек на прадпрыемства. Праўда, у хуткім часе многія хлопцы ідуць у армію, а вось вяртаюцца назад адзінкі. Думаю, Прэзідэнт своечасова звярнуў увагу на замацаванасць маладых спецыялістаў у адпаведнасці з прафесіяй. Варта разгледзець гэта пытанне на заканадаўчым узроўні.

ПАВАЖАНЫЯ КАЛЕГІ!

**Віншую калектыў прадпрыемства «Гроднааблдарбуд» З ПРАФЕСІЙНЫМ СВЯТАМ.**

*Хачу падзякаваць усім за добрасумленную працу і адданасць нашай агульнай справе дарожнага будаўніцтва. Якасныя дарогі дапамагаюць узмацняць эканамічную сферу нашай дзяржавы, робяць жыццё жыхароў больш зручным і камфортным. Работа дарожнай службы заўсёды навідавоку, а вынік працы можа ацаніць кожны. Прыемна, калі нашы дарогі выклікаюць пачуццё гонару за сваю краіну, свой рэгіён, а людзі выказваюць удзячнасць за своечасовы і якасны рамонт. Зрабіць дарогі бяспечнымі — менавіта на гэта і скіравана дзейнасць нашай службы. Вялікі дзякуй усім, хто воляй лёсу апынуўся ў гэтай прафесіі і застаецца ў ёй надалей. Нізкі паклон ветэранам працы. А сённяшнім супрацоўнікам — плённай працы, дабрабыту ў сем'ях, здароўя і актыўнага даўгалецця!*



Прараб асфальтабетоннага завода Леанід ГАЎРЫЛІК і кіроўца «МАЗа» Ігар МАРЦУТА.



Майстар Андрэй КАРНАЦЭВІЧ разам з дарожным рабочым Ільёй АЛІЕВЫМ і машыністам экскаватара Дзянісам КАЗАНЦАВЫМ займаюцца ўладкаваннем дваровай тэрыторыі з вышыннымі адзнакамі.

# ГРОДЗЕНСКАЯ ВОБЛАСЦЬ — ЛІДАР ПА РАМОНЦЕ ДАРОГ

## Уладзімір ЦЫЛЬКО, намеснік генеральнага дырэктара па эканоміцы КУП «Гроднааблдарбуд»:

— Ужо другі год з рэспубліканскага бюджэту выдзяляюцца дадатковыя сродкі на рамонт мясцовых дарог, што дае магчымасць павялічыць аб'ёмы работы. Мэтавыя паказчыкі дзяржаўнай праграмы па рамонце дарог і мастоў на 2023 год выкананы датэрмінова. Штогод прадпрыемствам капітальна рамантуецца каля 20 кіламетраў мясцовых дарог — гэта самы высокі паказчык у краіне.

Таксама працуем на значных аб'ектах рэгіёна. У іх ліку — будаўніцтва аб'язной дарогі ў Гродне і рэканструкцыя пуцеправода на Скідзельскай шашы, добраўпарадкаванне вуліцы Рэпіна ў гарадскім мікрараёне Фолюш, падрыхтоўка гарадскога пасёлка Зэльва да абласных «Дажынак». Ажыццяўляем бягучыя рамонты вулічна-дарожнай сеткі раённых цэнтраў.

Высокія тэмпы захаваюцца і надалей. Па папярэдніх даных, вядзецца гаворка аб павялічэнні фінансавання з рэспубліканскага бюджэту. Павялічыцца фінансаванне з абласнога бюджэту на ўтрыманне дарог, куды ўваходзіць ямачны рамонт, пакосы абочын, ачыстка ад снегу, прафіляванне гравійных і грунтавых дарог, прыборка смецця. Дарэчы, смецця ўздоўж дарог стала менш, але праблема застаецца актуальнай у частцы назапашвання адходаў на прыпынках транспарту каля садаводчых таварыстваў.



Начальнік ДРБУ № 118 Андрэй КАЗЛОЎСКІ і намеснік генеральнага дырэктара па эканоміцы Уладзімір ЦЫЛЬКО абмяркоўваюць вытворчыя планы.

# ЛЮДЗІ, ЯКІЯ БУДУЮЦЬ ДАРОГІ...

**Андрэй Казлоўскі,** начальнік ДРБУ-118, на пасадзе 18 гадоў. Пасля заканчэння БДТІ (зараз БДТУ) прайшоў усе ступені кар'ернай лесвіцы: ад майстра да кіраўніка падраздзялення. А пачынаў прарабам на будаўніцтве пуцеправода ў Гродне. Затым на дарожных работах у гарадскім пасёлку Мір. За час работы ў Зэльве яму ўдалося сабраць трывалы і надзейны калектыў.

Напрыклад, **Андрэй Марцута** пачынаў дарожным рабочым, потым кіроўцам. Па мэтавым накіраванні скончыў тэхнікум, працаваў галоўным інжынерам, нядаўна прызначаны начальнікам Навагрудскага ДРБУ-189. Майстар **Андрэй Карнацэвіч** пачынаў простым вартаўнікам, закончыў тэхнікум па спецыяльнасці «Грамадзянскае будаўніцтва». Яго брыгада добра паказала сябе на рабоце па добраўпарадкаванні Зэльвы да абласных «Дажынак».

Дарэчы, у ДРБУ-118 больш, чым у іншых падраздзяленнях, працуе работнікаў, якія маюць званні **«Ганаровы дарожнік»**. Лаўрэатам звання летась стаў вадзіцель МАЗа **Віктар Парфяновіч,** стаж якога на прадпрыемстве дасягае чвэрці стагоддзя. А працаваць пачаў яшчэ на першым МАЗе, якія толькі сталі сюды паступаць. Цяпер працуе ўжо на трэцім па ліку. Але трапіў на дарожна-будаўнічае прадпрыемства не адразу. Працаваў у Карэліі, дзе яго напаткаў развал Савецкага Саюза. Тады мала якія прадпрыемствы трымаліся на плаву, а вось дарожнікі працавалі стабільна, гэта і стала вызначальнай пазіцыяй для Віктара Парфяновіча. Сёлета яму выходзіць на заслужаны адпачынак, але думае працаваць і надалей. У ліку «ганаровых дарожнікаў» — і прараб ДРБУ-118 **Леанід Гаўрылік.** Прыйшоў у дарожную сферу ажно 46 гадоў таму, адразу пасля арміі. Так і застаўся тут на ўсё жыццё. Успамінае, што дарогі ў той час былі не такія, як цяпер. У асноўным грунтавыя і гравійныя. Сітуацыя кардынальна змянілася пасля таго, як у падраздзялення з'явіўся свой асфальтавы завод. Пазней набылі больш дасканалы. Сёння ў дзень выпрацоўваецца 250 тон асфальтабетоннай сумесі. Практычна ўсё адразу ідзе ў справу. Прычым работы вядуцца не толькі на аўтадарожных участках. Значная ўвага — добраўпарадкаванню дваровых тэрыторый. Асфальтуюцца пляцоўкі, паркоўчачныя месцы, зоны адпачынку...



Злева направа: кіроўца Віктар ПАРФЯНОВІЧ, машыніст змяшальніка асфальтабетону Анатоль СВІСТУН, здрабняльшчык Юрый МАРЧУК.

Амаль 20 гадоў займаецца ўкладкай асфальту **Алег Аліеў**, які таксама мае званне «Ганаровы дарожнік». У яго даволі адказны ўчастак — трэба кантраляваць таўшчыню пласта, ад гэтага залежыць, наколькі роўным будзе дарожнае палатно. Тут уся работа, што называецца, навідавоку. Вядома, і самому прыемна бачыць вынік. Вось і сын пацягнуўся за бацькам. Паездзіў на заробкі ў Польшчу, але вярнуўся ў родныя мясціны, уладкаваўся дарожным рабочым. Аказалася, што і тут можна нядрэнна зарабіць, бо дарожнае будаўніцтва заўсёды запатрабавана, і попыт на кадры толькі расце.

У ДРБУ-118 цэлая кагорта ганаровых дарожнікаў. У іх ліку — і машыніст пагрузчыка **Аляксандр Канаховіч**, які 25 гадоў застаецца верны і роднай Зэльве, і свайму прадпрыемству. Прычым не толькі добрасумленна выконвае свае працоўныя абавязкі, але і ўносіць прапановы па ўдасканальванні тэхнікі. Аляксандр правёў мадэрнізацыю пагрузчыка, прыстасаваўшы здымны грэйдарны нож. Такім чынам тэхніка працуе як аўтагрэйдар. Асаблівую ўвагу аддае абочынам. Для яго важна, каб не толькі дарога была роўнай, але і тэрыторыя вакол яе.



Дарожныя рабочыя Алег АЛІЕЎ і Андрэй ТАРАМЫНА разам з машыністам асфальтаўкладчыка Аляксеем МАЦКЕВІЧАМ пад кіраўніцтвам майстра па асфальтаўкладцы Сяргеем ЮШЧЫКАМ укладваюць асфальтабетонную сумесь.

У ДРБУ-118 падтрымліваюць ініцыятыўных і адказных работнікаў. Такіх, як прараб **Надзея Мелех,** майстар па ўтрыманні дарог **Максім Гаўрылаў,** майстар асфальтаўкладкі **Сяргей Юшчык**. Адзначаецца вялікая роля ў развіццё прадпрыемства інжынера-механіка **Мікалая Трахімовіча,** энергетыка **Васіля Сідорыка,** начальніка планава-тэхнічнага сектара **Васіля Арачкі,** кіраўніка аддзела бухгалтарскага ўліку **Ганны Чашэйкі.**

Самых добрых слоў заслугоўваюць брыгады па ўкладцы пліткі, якія асвойваюць за дзень 150-200 «квадратаў». Важная ў гэтай справе і ўстаноўка барта. Асабліва важная праца брыгады **Вячаслава Картэля,** якая цяпер задзейнічана на будаўніцтве аб'язной дарогі ў абласным цэнтры.

Наперадзе ў дарожнікаў нямала новых і адказных аб'ектаў. Напрыклад, ужо вядома, што супрацоўнікі філіяла прымуць удзел у падрыхтоўцы яшчэ аднаго райцэнтра да «Дажынак». У хуткім часе яны адправяцца ў горад Масты, які ў наступным годзе прыме абласное свята аграрыяў. Няма сумненняў, што чарговая сталіца «Дажынак» таксама будзе адноўлена.

# ЯК ДАРОЖНІКІ АГРАРЫЯЎ СУСТРАКАЛІ

## Філіялы «Гроднааблдарбуда» прынялі ўдзел у падрыхтоўцы Зэльвы да абласных «Дажынак»







Тэрыторыя школы № 3 у г. п. Зэльва пасля рэканструкцыі і добраўпарадкавання тэрыторыі.

У гарадскім пасёлку адноўлена каля 90 аб'ектаў, у тым ліку дарожнай інфраструктуры. Чатыры філіялы КУП «Гроднааблдарбуд» правялі рамонт вуліц, добраўпарадкавалі тэрыторыю сацыяльных аб'ектаў, мемарыяльных месцаў, спартыўных пляцовак і стадыёнаў. Многія аб'екты патрабавалі амаль ювелірнай работы, напрыклад, баскетбольныя і валейбольныя пляцоўкі, бегавыя дарожкі, дзіцячыя пляцоўкі і іншыя.

Многія вуліцы Зэльвы набылі новае аблічча. На іх рэканструкцыю і капітальны рамонт за кошт сродкаў абласной інвестпраграмы было выдзелена каля пяці мільёнаў рублёў. Сумесна з галоўным падрадчыкам — ДРБУ-118 — працавалі філіялы №№ 209, 208 і 188. Былі задзейнічаны яшчэ 11 субпадрадных арганізацый. Дзякуючы добрым тэмпам, усе работы былі выкананы ў тэрмін. Адноўлены вуліцы імя Кутузава, Матросава, 50 гадоў СССР, імя Чапаева, Калініна, Дзяржынскага, Гагарына і іншыя. На месяц раней завяршыўся рамонт вуліцы Вакзальнай — тут з'явіліся тратуары і веладарожка. На месцы былога бруку — асфальтабетон. Жыхарам цяпер зручна дабірацца да чыгуначнага вакзала.

А пачаліся работы з вуліцы імя Заслонава. Датычна яе заўсёды было нямала скаргаў ад жыхароў. Звароты атрымліваў і **начальнік ДРБУ-118 Андрэй КАЗЛОЎСКІ.** Звярталіся да яго зэльвенцы і як да дэпутата райсавета. Паабяцаў дэпутат, што да фестывалю «Дажынкі» сітуацыя зменіцца. Так і атрымалася. На аб'ект накіравалі найлепшую брыгаду па добраўпарадкаванні. Работы вяліся два месяцы. Цяпер тут роўны асфальт, новыя дарожныя знакі, разметка, прыгожы далягляд.

— Зроблена ў гарадскім пасёлку сапраўды нямала, магчыма, як ні ў якім іншым райцэнтры, — заяўляе Андрэй Пятровіч. — Зэльву падрыхтавалі не толькі да «Дажынак», але і для камфортнага жыцця. Значную ролю адыграла тое, што работы пачалі загадзя, своечасова была падрыхтавана дакументацыя, выдзелены сродкі.

Дарэчы, работы па рамонце дарог вядуцца не толькі ў Зэльве, але і на ўсёй тэрыторыі раёна. Нядаўна завяршыўся рамонт дарогі ў вёсцы Цяглевічы.

— Раней участак у 1,5 кіламетра быў у аварыйным стане, цяпер тут ляжыць новы асфальт. Літаральна за тыдзень пакладзена больш за адну тысячу тон асфальтабетоннай сумесі, — каментуе работы Андрэй Казлоўскі. — Калі дарогі своечасова рамантуюцца, яны і служаць даўжэй. У Зэльвенскім раёне, які абслугоўвае ДРБУ-118, стан дарог можна назваць здавальняючым.

За мінулы год ДРБУ-118 увайшло ў тройку лідараў у сферы аховы працы сярод прадпрыемстваў Гродзенскай вобласці колькасцю да ста чалавек. І ў мінулыя перыяды дарожна-рамонтнае ўпраўленне аказвалася ў ліку лідараў і прызёраў сярод філіялаў КУП «Гроднааблдарбуд».





**Маргарыта УШКЕВІЧ, Алена ДАЎЖАНОК. Фота Лізаветы ГОЛАД.**

УНП 500036511

БЕЛАВТОДОР

# ГАНАРЫМСЯ МІНУЛЫМ — БУДУЕМ БУДУЧЫНЮ!

**Адкрытае акцыянернае таварыства «Дарожна-будаўнічы трэст № 1 г. Віцебск» холдынга «Белаўтадар» у наступным годзе адзначае 55-гадовы юбілей. Больш чым за паўстагоддзя віртуозы дарожнай галіны паўночнага рэгіёна ўвялі ў эксплуатацыю каля 10 тысяч кіламетраў аўтадарог не толькі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, але і ў суседняй Расійскай Федэрацыі. Высокі давер з боку замежных заказчыкаў абумоўлены напрацаваным за доўгія гады аўтарытэтам прадпрыемства, галоўнае крэда якога — рабіць якасна і ў тэрмін.**



Генеральны дырэктар Алег КАПЦЭВІЧ.

**Паважаныя работнікі дарожнай галіны і ветэраны!
Прыміце самыя цёплыя віншаванні з прафесійным святам!**

Транспартны комплекс заўсёды з'яўляўся надзейным падмуркам устойлівага і дынамічнага развіцця ўсіх галін народнай гаспадаркі. І сёння ролю дарожнай галіны ў нашай сучаснай цывілізаванай краіне цяжка пераацаніць. Ад належнага стану ўсёй транспартнай інфраструктуры залежаць эканоміка, сацыяльная сфера, лёс і шчасце мільёнаў людзей.

Высокатэхналагічны век ставіць перад дарожнікамі новыя задачы — павышэнне якасці будаўніцтва і рамонту, пераход на больш высокі ўзровень утрымання аўтадарог, выкарыстанне сучасных тэхналогій і высакаякасных матэрыялаў. Дзякуючы адданасці і вернасці сваёй справе, высокай долі адказнасці, прафесіяналізму дарожнікі выконваюць пастаўленыя задачы, кідаючы выклік часу.

Самыя шчырыя словы падзякі хочацца выказаць ветэранам, якія прысвяцілі ўсё сваё жыццё адказнай справе будаўніцтва аўтамагістраляў, перадаючы багаты вопыт і веды маладому пакаленню.

Жадаю ўсім працаўнікам галіны моцнага здароўя, незгасальнага аптымізму, добрых аб'ектаў і мірнага неба над галавой!

**Генеральны дырэктар ААТ «Дарожна-будаўнічы трэст № 1 г. Віцебск» А. В. КАПЦЭВІЧ.**



Дырэктар філіяла ДБУ-2 Леанід БАТУРА, намеснік начальніка аддзела механізацыі і энергетыкі ААТ ДБТ-1 Мікалай ФЕДАРОВІЧ і галоўны тэхнолаг Аляксандр КРАЎЧАНКА абмяркоўваюць вытворча-тэхнічныя пытанні на тэрыторыі асфальтабетоннага завода.

## ДБТ № 1: учора, сёння, заўтра

Дарожна-будаўнічы трэст № 1 г. Віцебск выконвае работы па будаўніцтве, рэканструкцыі, рамонце аўтамабільных дарог і штучных збудаванняў на іх, пакрыццяў аэрадромаў, добраўпарадкаванні населеных пунктаў у краіне і за яе межамі. Наяўнасць сучаснай дарожна-будаўнічай тэхнікі, абсталявання вядучых сусветных вытворцаў, высокі прафесіяналізм працаўнікоў, прымяненне прагрэсіўных тэхналогій і інавацый у будаўніцтве дазваляюць прадпрыемству выконваць самыя, на першы погляд, складаныя задачы.

Свой адлік прадпрыемства вядзе з 15 кастрычніка 1969 года, калі былі злучаны аб'яднанні дарожна-будаўнічых упраўленняў Полацка, Віцебска, Верхнядзвінска, Оршы, Шаркаўшчыны, а ў 1972 годзе і Лепеля. Сёння паспяхова працуюць філіялы трэста № 1: ДБУ-2 у Полацку, ДБУ-3 у Віцебску, ДБУ-7 у Оршы і ДБУ-26 у Шаркаўшчыне.



Галоўны інжынер Сяргей КЛЯБАНАЎ дэманструе геаграфію работы прадпрыемства.

Аб паспяховых працоўных выніках трэста сведчаць лічбы: у 2021 годзе выручка склала 55 мільёнаў рублёў, у 2022-м — 119 мільёнаў, за дзевяць месяцаў бягучага года ўжо выручана 140 мільёнаў, кіраўніцтва да канца года плануе падняць гэтую планку да 190 мільёнаў рублёў. Сёлета як ніколі вялікі акцэнт зроблены на добраўпарадкаванне мясцовых дарог, значныя аб'ёмы работ па бягучым рамонце выкананы на тэрыторыі Віцебскай вобласці. У 2023 годзе трэстам было выпушчана 397 тысяч тон асфальтабетонных сумесяў.

У бягучым годзе быў абноўлены аўтапарк трэста, у якім сёння налічваецца звыш 400 адзінак тэхнікі: набыты два бульдозеры, чатыры экскаватары, дзесяць самазвалаў, тры каткі. Прадпрыемства аказвае паслугі арэнды спецыялізаванай і дарожна-будаўнічай тэхнікі ў сваіх філіялах, чым актыўна карыстаюцца прыватныя кампаніі і насельніцтва. Аднак цяпер з-за вялікіх аб'ёмаў дарожных работ трэст сам прыцягвае арэндныя бульдозеры і экскаватары — «артэрыі жыцця» чакаць не будуць.

Некалькі гадоў таму ў прадпрыемства стаяла кадравае пытанне: шмат хто з маладых спецыялістаў у пошуках лепшай долі спяшаўся з'ехаць за мяжу, аднак апошнім часам сітуацыя ў калектыве стабілізавалася. Кіраўніцтва трэста праводзіць вялікую прафарыентацыйную работу і даволі паспяхова прыцягвае маладыя кадры з устаноў адукацыі рэгіёна і краіны. Сярэдняя зарплата ў трэсце — 2160 рублёў, у летні сезон — асаблівы пік будаўніцтва — і таго вышэй.



Сакратар прыёмнай Людміла БУЛЫГІНА падчас размовы з заказчыкам.

У 90-я гады мінулага стагоддзя віцебскія дарожнікі будавалі Маскоўскую, Санкт-Пецярбургскую кальцавыя аўтадарогі, Балтыйскую трубаправодную сістэму, на старонках сучаснага летапісу прадпрыемства сёння таксама нямала сусветна важных аб'ектаў. «Кожны з іх дарагі па-свойму. Мы будуем і лясныя дарогі таксама, штораз адкрываючы новы шлях — а гэта сапраўды шлях для чалавека ў новыя магчымасці, — сэрца пачынае трымцець ад усведамлення важнасці і неабходнасці праведзенай працы. Напэўна, трэба быць дарожнікам ад нараджэння, каб зразумець гэта пачуццё», — дзеліцца **генеральны дырэктар ААТ «Дарожна-будаўнічы трэст № 1 г. Віцебск» Алег КАПЦЭВІЧ.**

Генеральны дырэктар як ніхто ведае, наколькі дарогі ў розныя часы існавання чалавецтва былі галоўнымі стратэгічнымі аб'ектамі. Алег Вадзімавіч вырашыў звязаць жыццё з дарожнай галіной яшчэ ў юнацтве, у 1986 годзе скончыў Мінскі політэхнічны інстытут. Там жа, у сталіцы, знайшоў сваё каханне, таксама з дарожнай сферы. Пачынаў пісаць працоўную біяграфію на пасадзе майстра ў ДБУ-3. Пасля быў старшым прарабам, галоўным інжынерам, выконваў абавязкі дырэктара ДБУ. У трэст № 1 г. Віцебск прыйшоў у 2005 годзе, і ўжо дзявяты год кіруе будаўнічым флагманам Віцебшчыны. Сын Алега Вадзімавіча таксама пайшоў па слядах бацькі і абраў прафесію дарожніка, працуе ў ДБУ-3 у Віцебску. Так і атрымалася, што дарога стала для кіраўніка галоўным сімвалам і па жыцці, і па прафесіі.

«Гэта сфера нялёгкая, безумоўна. Але і ў ёй ёсць свая цікавінка: пастаянныя камандзіроўкі-падарожжы, новыя знаёмствы, найкаштоўнейшы вопыт. Нельга не сказаць, што гэта прафесія не менш творчая за ўсе астатнія», — адзначае Алег Капцэвіч.



Мантаж жалезабетоннай трубы.

## Знак беларускай якасці

Цяпер працаўнікі прадпрыемства шчыруюць у тым ліку і на будаўніцтве ўчастка аўтадарогі першай катэгорыі А-289 Краснадар — Славянск на Кубані — Цямрук — аўтамабільная дарога А-290 Новарасійск — Керч, віцебскім віртуозам дарожнай сеткі даверана амаль 10 кіламетраў палатна. Аб'ект даволі складаны, іншыя кліматычныя ўмовы — спякота пад 40 градусаў і праліўныя дажджы — сталі для спецыялістаў сапраўдным выпрабаваннем на ўстойлівасць, а яшчэ — вялікая забалочанасць з-за рысавых чэкаў. Значная тэрытарыяльная аддаленасць — каля дзвюх тысяч кіламетраў — стварае пэўныя лагістычныя складанасці, аднак дзякуючы высокаму прафесіяналізму і аптымізацыі працоўнага працэсу аб'ект плануюць здаць у тэрмін у 2024 годзе.

Па словах генеральнага дырэктара Алега Капцэвіча, высокі давер з боку расійскіх калег абумоўлены толькі шматгадовай плённай працай многіх пакаленняў віцебскіх дарожнікаў. «Ужо трэці год мы ўдзельнічаем у тэндарах расійскага нацпраекта «Бяспечныя якасныя дарогі» на роўных з іншымі прадпрыемствамі. Вопыт і добрыя водгукі працуюць на наш аўтарытэт, як і здача аб'ектаў на высокім узроўні выканання ў тэрмін», — падкрэслівае Алег Вадзімавіч. Летась экспарт паслуг Расійскую Федэрацыю склаў 21 мільён долараў.

За 2023 год трэстам выкананы рамонт пяці ўчасткаў аўтамабільных дарог, размешчаных у Веліжскім раёне Смаленскай вобласці па Нацыянальным праекце «Бяспечныя якасныя дарогі». Працягласць адрамантаваных участкаў склала 30,2 кіламетра, пакладзена больш за 50 тысяч тон асфальтабетоннай сумесі.

## Прафесіяналы сваёй справы

Дарожна-будаўнічае ўпраўленне № 2 з'яўляецца адным з найвялікшых філіялаў трэста. У яго структуру ўваходзіць не толькі Полацк і Полацкі раён, але і Верхнядзвінск, дзе працуе свой асфальтабетонны завод і кар'ер. Яшчэ адзін участак знаходзіцца ў Лепелі — там таксама знаходзіцца АБЗ і два кар'еры. У самым старажытным горадзе нашай краіны пры ДБУ-2 працуюць два асфальтабетонныя заводы і кар'ер.

У 2019 годзе трэст набыў італьянскі завод «Марыні», які выпускае 200 тон асфальтабетоннай сумесі ў гадзіну. Дагэтуль мабільны завод кантэйнернага тыпу быў на аб'екце М-7, а летась яго перавезлі ў Полацк і аддалі ў эксплуатацыю ДБУ-2. За дзевяць месяцаў бягучага года з усіх чатырох заводаў полацкага ўпраўлення было выпушчана 190 тысяч тон асфальтабетоннай сумесі ўсіх тыпаў і марак, рэгламентаваных СТБ 1033 «Сумесі асфальтабетонныя дарожныя, аэрадромныя і асфальтабетон. Тэхнічныя ўмовы», да канца года плануюць выпусціць яшчэ каля 70 тысяч тон.

«Слаўныя працоўныя традыцыі нашага калектыву, які сёння складаюць 186 чалавек, закладвала не адно пакаленне дарожнікаў. Многія з нашых прафесіяналаў, людзей з вялікай літары, нават будучы на пенсіі, застаюцца ў страі, перадаючы прафесійны вопыт новаму пакаленню. Найбольш супрацоўнікаў у калектыве ва ўзросце 35—50 гадоў, але ёсць і нямала маладых спецыялістаў, якімі мы ганарымся. Штогод да нас прыходзяць 2–3 выпускнікі навучальных устаноў, большасць з іх замацоўваецца. Мы забяспечваем кадры жыллём, у залежнасці ад фінансавых магчымасцяў прадпрыемства дае крэдыт на будаўніцтва. Сярэдняя зарплата ў ДБУ-2 — дзве тысячы рублёў, у летні перыяд даходзіць да дзвюх з паловай тысяч. Адным словам, імкнёмся стварыць усе ўмовы, каб дарожная галіна была прывабнай і перспектыўнай для маладых людзей», — расказвае **дырэктар ДБУ-2 Леанід БАТУРА.**

Аб сваіх працаўніках кіраўніцтва полацкага ўпраўлення клапоціцца з усіх бакоў, пацвярджэннем гэтага факта з'яляецца і тое, што ДБУ-2 з'яўляецца адзіным філіялам трэста, які захаваў сваю сталовую. У большай ступені гэта ўдалося зрабіць дзякуючы энтузіязму людзей, якія на працягу многіх гадоў гасцінна, смачна і па-хатняму запрашаюць за стол пасля цяжкага працоўнага дня. У ліку такіх — кухар Ірына Мікалаеўна Кузьміна, для якой упраўленне — бадай адзіны запіс у працоўнай кніжцы. «Важна, каб людзям было зручна. А, як той казаў, галодны работнік — дрэнны работнік, таму і імкнёмся падтрымліваць калектыў нават у такіх бытавых пытаннях», — усміхаецца дырэктар. А гэта правільна і вельмі важна.



Начальнік аддзела механізацыі і энергетыкі Ігар КУДЗЕЛЬ абмяркоўвае развіццё прадпрыемства ў рамках мадэрнізацыі тэхнічнай базы разам з вядучым інжынерам Аленай БАТАВАЙ і вядучым інжынерам-механікам Яўгенам МІКАЛАЕВЫМ.



Геадэзіст Антон ДЗЯРКО, вядучы геадэзіст Аляксандр ТАРАСЕНКА і майстар Кірыл ГАЛІНОК займаюцца разбівачнымі работамі на 58-м кіламетры ўчастка дарогі Р-46.



Фота Алены ДАЎЖАНОК.

Галоўны інжынер ДБУ-26 г. п. Шаркаўшчына Сяргей ГРЫЦ, брыгада асфальтаўкладкі.

## З вецярком — па новай трасе!

Актыўнымі тэмпамі вядзецца рэканструкцыя ўчастка аўтадарогі Р-46 Полацк — Лепель. Дарогу называюць стратэгічнай з лагістычнага боку: у напрамку Санкт-Пецярбурга па ёй штодзённа перамяшчаюцца сотні аўтамабіляў, у тым ліку і велікагрузаў.

Цяпер аб'ект знаходзіцца на другой чарзе будаўніцтва, дарожнікі шчыруюць на 30-кіламетровым участку Полацк — Сарочына. Пасля спецыялісты дарожнай галіны пяройдуць на другі такі ж участак Сарочына — Лепель. Здаць трасу ў эксплуатацыю плануюць у лютым 2025 года. Кожны работнік на ўчастку — неад'емны элемент у адзіным механізме, бо менавіта гэтыя людзі пракладваюць «дарожныя артэрыі» ў светлую будучыню.

Сярод тых, хто працуе на 51-м кіламетры трасы Р-46 — машыніст аўтагрэйдара Дзмітрый Мазго. Мужчына хутка адзначыць 20-гадовы юбілей, як працуе ў ДБУ. Калісьці абраў прафесію наўгад, а пасля так прыкіпеў душой да тэхнікі, што ніколі не думаў з яе сысці. Сам Дзмітрый жыве ў Лепелі, пад Полацкам на рэканструкцыі трасы знаходзіцца ў камандзіроўцы, але, як расказвае машыніст, былі на яго памяці і больш далёкія аб'екты. «Працаваў і на М-3, нядаўна вярнуўся з Пскоўскай вобласці. Цікава, як ні круці — усё ж такі турызм, але своеасаблівы, працоўны», — жартуе Мазго. 18 гадоў ён адпрацаваў на айчынным аўтагрэйдары, а два гады таму атрымаў новы HBM-NOBAS, прадукцыйнасць працы вырасла ў разы. Ад Дзмітрыя залежыць важны этап падрыхтоўкі ўчастка перад фінальным пакрыццём асфальтабетонам, таму ўвага і дбайнасць — асноўныя прынцыпы работы машыніста.

«Сёлета ў спецыялістаў даволі вялікі аб'ём работ: дагэтуль дарога была другой катэгорыі, шырыня праезнай часткі дасягала ўсяго сямі метраў. У сувязі з вялікім транспартным патокам і неабходнасцю павелічэння прапускной здольнасці было прынята рашэнне аб рэканструкцыі аб'екта. Па выніках будаўнічых работ трасе будзе нададзена другая катэгорыя, шырыня праезнай часткі складзе 12 метраў», — падкрэслівае Леанід Батура.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, Алена ДАЎЖАНОК.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

УНП 300000398



Начальнік вытворча-тэхнічнага аддзела Андрэй ГАРНОЎСКІ разам з калектывам. Злева направа: намеснік начальніка ВТА Кірыл ГАЛАЎКОЎ, вядучы інжынер ВТА Наталля БАЙКОВА, інжынер ВТА Зоя РЫМАШЭЎСКАЯ, вядучыя інжынеры ВТА Марына РАМЕЙКА і Ганна НІКІЦІНА.



Калектыў бухгалтэрыі злева направа: намеснік галоўнага бухгалтара Марыя ПЕХЦЕРАВА, вядучыя бухгалтары Ганна ТКАЧЭНКА і Наталля ШАРЭНДА, галоўны бухгалтар Людміла ЛАЎРАНЮК, намеснік галоўнага бухгалтара Анастасія ЗЯНЬКОВА, вядучыя бухгалтары Алена КУПЧАНКА і Алена СЕРАФІМАВА.



Начальнік планава-эканамічнага аддзела Андрэй ПЕХЦЕРАЎ разам з вядучым эканамістам Аленай ЗАЗЕКА і намеснікам генеральнага дырэктара па эканоміцы Сяргеем БУЛАЕМ разглядаюць выкананне эканамічных паказчыкаў прадпрыемства за 2023 год.

# ЛЁГКАЙ ВАМ ДАРОГІ!

**Традыцыйнае пажаданне тым, хто адпраўляецца ў шлях. Па сутнасці, мы ўсе ўвесь час у дарозе: ці то едзем на працу, ці то ў іншы горад, ці то вандруем. І вельмі важна, каб гэтыя дарогі былі роўнымі, прасторнымі і сапраўды лёгкімі. Тады і падарожнічаць па іх будзе прыемна і бяспечна. Знамянальна, што прыгожых, зручных і камфортных вуліц, магістраляў, аўтабанаў становіцца ў краіне, і ў Магілёўскай вобласці ў прыватнасці, з кожным годам усё больш. І ў гэтым вялікая заслуга майстроў з вялікай літары з магілёўскага «ДБТ № 3».**



Дарагія калегі і сябры, віншую вас з нашым агульным прафесійным святам —

**Днём аўтамабіліста і дарожніка!**

Ад усёй душы жадаю вам стабільнасці, жыццёвага аптымізму і святочнага настрою. Няхай у вашых сем'ях заўсёды пануе згода і дабрабыт, шчырасць і ўзаемаразуменне, а ўсе родныя і блізкія будуць здаровыя і шчаслівыя. Праца дарожніка заўсёды была цяжкая і напружаная, але ганаровая і важная. Вы першапраходцы, гаспадары вялікіх дарог! Асабістага шчасця, новых творчых здзяйсненняў, прафесійнага росту!

**З павагай, генеральны дырэктар ААТ «ДБТ № 3» Валерый ПАЛЯКЕВІЧ.**

## ЗАМКНЁНАЯ ВЫТВОРЧАСЦЬ

ААТ «ДБТ № 3» — гэта цэлы комплекс упраўленняў і ўчасткаў, тры з якіх функцыянуюць у Бабруйску, Горках і Крычаве. Непасрэдна ў Магілёве працуюць будаўнічае ўпраўленне і ўпраўленне падсобнай вытворчасці.

Дарожныя будаўнікі бабруйскага ДБУ № 16 працуюць на розных пляцоўках у Беларусі і Расіі, але асноўная іх сфера ўплыву — сёмы па колькасці насельніцтва ў Беларусі Бабруйск. Сёлета яны шмат чаго зрабілі, каб гэты горад стаў больш мабільны.

— У сёмым, самым маладым, мікраараёне горада завяршылі будаўніцтва адразу дзвюх вуліц — Народнага адзінства, Дняпроўскай флатыліі і бульвара Прыбярэзенскага, — расказвае **начальнік «ДБУ № 16» Анатоль КІСЯЛЕВІЧ**. — Сёлета заканчваем праспект Будаўнікоў, вуліцу Папова, якая знаходзіцца крыху бліжэй да цэнтра горада. У Кісялевічах пабудавалі новыя вуліцы — Наумава, Панова і Уладзімірскую. Працягваюцца работы на маставым пераходзе праз Беразіну, там ужо распачаўся рух, але работы яшчэ шмат. Трэба ўмацоўваць дамбу, конусы...

Цярплівасць і гібкасць — без гэтых якасцяў немагчыма быць дарожным будаўніком, — лічыць **начальнік горацкага «ДБУ № 27» Антон УГНАЧОЎ.**

— Мы вельмі залежым ад надвор'я, — тлумачыць ён. — Калі яно сапсавалася, трэба аператыўна перастройвацца і мяняць планы. Гэта трымае нас у тонусе і прымушае шукаць нестандартныя рашэнні.

Асноўнымі будоўлямі горацкага ўчастка сёлета былі вуліцы Луначарскага і Чырвоная Слабада ў Шклове — праводзіўся іх капітальны рамонт. У Горках акрамя шараговых бягучых рамонтаў распачалося будаўніцтва новай вуліцы — Вакзальнай.

— Нагрузка на дарогі апошнім часам расце. Машын становіцца болей, павялічваецца іх вага, — рэзюмуе Антон Угначоў. — Калі 20 гадоў таму вялікай машынай лічыўся 20-тоннік, то цяпер па трасах курсіруюць 30- і нават 45-тоннікі. Таму ўмацоўваем дарогі, робім іх больш зносастойкімі.

Асаблівасць крычаўскага «ДБУ № 20» у тым, што ён, умоўна кажучы, амаль цалкам кантралюе паўднёва-ўсходні рэгіён вобласці. «Базіруемся адначасова ў двух раёнах, — удакладняе **начальнік участка Дзяніс ШАТУХА.** — Адзін асфальтабетонны завод знаходзіцца ў Крычаве, другі — у Касцюковічах. Абслугоўваем усе раёны паміж гэтымі двума пунктамі — Крычаўскі, Чэрыкаўскі, Клімавіцкі. Сёлета сумесна з «Магілёўаўтадарам» удзельнічалі ў падрыхтоўцы дарог да «Дажынак» у Хоцімску. А налета будзем займацца будаўніцтвам і рэканструкцыяй вуліц Клімавіч, якія стануць сталіцай «Дажынак».

Сёлета «ДБУ № 20» займаўся падрыхтоўкай пляцовак для рэканструкцыі моста праз раку Сож на аўтадарозе Р-74 у Чэрыкаве. А паколькі гэта знаходзіцца ў раёне вуліцы Болдзіна, была зроблена не толькі замена пакрыцця, але і добраўпарадкаванне з уладкаваннем тратуараў і пешаходных пераходаў. Каб палепшыць гідраізаляцыю металічнага збудавання, арганізацыя сёлета засвоіла вытворчасць вібралітой асфальтабетоннай сумесі. Сіламі крычаўскага ДБУ была таксама зроблена і здадзена першая чарга пуцеправода праз чыгунку на аўтадарозе Р-43 і распачаты работы па будаўніцтве другой чаргі аб'екта.

Па сутнасці, трэст уяўляе сабой у нейкім родзе замкнёную вытворчасць, якая забяспечвае сябе ўсім неабходным, пачынаючы ад пяску і асфальтабетону, заканчваючы тратуарнай пліткай і металаканструкцыямі. Кожны ўчастак займаецца вытворчасцю асфальтабетону на месцах, але галоўны пастаўшчык будматэрыялаў у маштабах «ДБТ № 3» — упраўленне дапаможнай вытворчасці, якое знаходзіцца ў Магілёве. Менавіта тут ствараюцца вібрапрасаваныя вырабы — тратуарная плітка, тратуарны і дарожны бардзюр, вырабы з драўніны, металаканструкцыі. Толькі для трасы-дублёра было зроблена каля двух кіламетраў парэнчавай агароджы. Пры ўпраўленні функцыянуе чыгуначная ветка, якая прымае ў суткі да дзвюх тысяч тон шчэбеню розных фракцый і адсеў. За дзень прадпрыемства вырабляе да 470 квадратных метраў тратуарнай пліткі. «І ўся яна цалкам запатрабаваная», — удакладняе **начальнік упраўлення Юрый БЯЗМЕН.** Дарэчы, менавіта тут выпрабляецца featured рознакаляровая плітка, якой апошнім часам упрыгожваюцца вуліцы і праспекты Магілёва. А ўпершыню яна стала выкарыстоўвацца на трасе-дублёры.

Трэст увесь час знаходзіцца ў стане абнаўлення і пошуку новых падыходаў і метадаў работы. Летась, напрыклад, пры ўпраўленні дапаможнай вытворчасці з'явіўся новы ўчастак па перапрацоўцы другаснай сыравіны, якая атрымліваецца пры дэмантажы дарожных аб'ектаў. Гэтыя будаўнічыя адходы пасля драблення зноў выкарыстоўваюцца ў рабоце. Гэтае ж упраўленне даводзіць дарожны аб'ект да кандыцыі. Не толькі ўпрыгожвае яго сваімі вырабамі, але і робіць электрамантаж. Адным словам, дапамагае здаваць яго «пад ключ».





Машыніст экскаватара Вячаслаў МЯДЗВЕДЗЕЎ.



На будаўнічых аб'ектах працуе магутная тэхніка.

## РАЗАМ — МЫ СІЛА!

— Наша работа вельмі важная і ганаровая, — падкрэслівае **генеральны дырэктар ААТ «ДБТ № 3» Валерый ПАЛЯКЕВІЧ.** — Але без узаемадзеяння з нашымі партнёрамі яна немагчыма. Перш за ўсё гэта наш холдынг «Белаўтадар», які дапамагае вырашаць складанасці, звязаныя з дарожнымі аб'ектамі. Мы ўдзячныя нашым калегам з ААТ «ДБТ № 5» і ААТ «Мастабуд» за супрацоўніцтва.

Разуменне і падтрымку мы знаходзім у кіраўніцтва вобласці і на месцах. Вялікую ўвагу нашай рабоце сёлета ўдзяляў мэр Магілёва Аляксандр Студнеў, ён прымаў удзел у нашых вытворчых сходах, садзейнічаў у вырашэнні складаных пытанняў.

Наш трэст ганарыцца сваімі работнікамі і кіраўнікамі. Людзьмі, якія, нягледзячы на неспрыяльнае надвор'е, нейкія тэхнічныя моманты, аддаюць усе свае сілы і веды на карысць справе. Яны сапраўдныя прафесіяналы. Дзякуй вам за вашы працавітыя рукі, за ваша сумленне, за патрыятызм і любоў да Радзімы. Бо без гэтага немагчыма стварэнне высакаякасных дарог.

Наш залаты фонд — ветэраны, усе тыя, хто працаваў на карысць прадпрыемства і ўсімі сіламі дабіваўся, каб яно стала найлепшым. Сярод іх — былы генеральны дырэктар «ДБТ № 3» Рыгор Цімафееў, пры якім і ствараласяўся ўся гэтая моц. Тое, што было закладзена нашымі папярэднікамі, спрацавала. Мы дасягнулі добрых вынікаў. З лёгкай душой магу сказаць, што і ў наступны год мы глядзім з упэўненасцю. Партфель заказаў сфарміраваны на ўсе 100 працэнтаў. Мы плённа папрацавалі сёлета і не збіраемся збаўляць тэмпы. Мы з упэўненасцю крочым у прыгожае заўтра. І хочацца, каб гэты настрой захаваўся ў нас назаўсёды.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, Алена ДАЎЖАНОК.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

УНП 700049607

## АБ'ЕКТЫ, ЗА ЯКІЯ НЕ СОРАМНА

Як кажуць яны самі пра сябе, галоўная наша каштоўнасць — гэта кваліфікаваныя, добрасумленныя і працавітыя людзі — патрыёты і асы сваёй справы.

Сёлетні год для дарожных будаўнікоў быў асабліва ўдалы. Уведзены ў строй новыя дарогі, адрамантаваны шэраг ужо існуючых. Калектыў, а гэта болей чым 1000 чалавек, загружаны на поўную магутнасць. У сярэднім у рабоце да 50 розных аб'ектаў кожны месяц.

— Мы сапраўды плённа папрацавалі, — не хавае свайго ўзнятага настрою **генеральны дырэктар ААТ «ДБТ № 3» Валерый ПАЛЯКЕВІЧ** і звяртае ўвагу на важныя ўзнагароды, якія займаюць пачэснае месца ў яго кабінеце, — дыплом пераможцы сярод будаўнічых арганізацый Магілёва па выніках мінулага года, пасведчанне аб занясенні на Дошку гонару і пераходны сцяг. — Гэты год яшчэ не скончыўся, але можна сказаць, што з задачамі, якія ставілі перад сабой, мы справімся. Нашы поспехі — гэта сумесная праца ўсіх работнікаў ДБТ: пачынаючы ад рабочага, заканчваючы кіраўнікамі.

Магілёў стаў больш прыгожы, утульны, стыльны. Сіламі ДБТ рэканструявана вуліца Будаўнікоў, лічы, наноў адбудаваная, прычым у сціслыя тэрміны — усяго за два месяцы, вуліца Камсамольская. Тут заменена аснова пад дарожнае пакрыццё, абнавіліся пешаходныя зоны, вонкавае асвятленне.

— Вельмі радасна за нашых спецыялістаў і работнікаў, — прызнаецца суразмоўнік. — Яны здольныя рабіць немагчымае. А ў спалучэнні з сучаснымі тэхналогіямі, якія мы прымяняем, атрымліваецца якасны вынік. Грамадзяне задаволеныя — паляпшаецца структура дарогі, знікае ямачнасць.Сёння на вачах гараджан набываюць прэзентабельны выгляд праспекты Пушкінскі і Дзімітрава, парадныімі дзякуючы рознакаляровай плітцы (спалучэнне шэрай, чырвонай і зялёнай) становяцца новыя тратуары.

Асаблівы гонар дарожных будаўнікоў — 12-кіламетровы ўчастак паўднёва-заходняга абходу Магілёва, на якім сёлета ў чэрвені адкрыўся аўтамабільны рух. Магілёў стаў другім у краіне пасля Мінска, дзе ёсць кальцавая дарога. Гэта істотна разгрузіла гарадскія і загарадныя дарогі і напрамкі ад велікагрузнай тэхнікі. Заказчыкам абходу кальцавой дарогі выступаў РУП «Магілёўаўтадар».

Вельмі значны аб'ект — другая чарга пуцеправода-дублёра. Сёлета ўжо па традыцыі яе ўводзілі да свята 17 верасня. Удзел ва ўрачыстым мерапрыемстве прымаў **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА.**

— Пазалетась мы на гэту дату адкрывалі першую чаргу, сёлета — другую, — адзначае генеральны дырэктар. — Налета плануем здаць да гэтага ж свята трэцюю чаргу і выйдзем на кальцо ў мінскім напрамку. Гэта істотна разгрузіць транспартныя магістралі.

## АМБІЦЫЙНЫЯ ПРАЕКТЫ

Эканамічныя паказчыкі гавораць самі за сябе. Дастаткова адзначыць, што тэмпы росту выручкі па трэсту склалі 158 % да ўзроўню мінулага года.

— У сувязі з гэтым расце зарплата, павялічваюцца выплаты ў бюджэт, — канстатуе **намеснік генеральнага дырэктара Леанід ЗАХАРКЕВІЧ.** — Дзякуючы кіраўніцтву горада і вобласці, у нас ёсць работа ў рэгіёне. Сёлета мы працуем на двух аб'ектах, якія знаходзяцца за межамі Магілёўскай вобласці, — гэта Р-46 у Віцебскай вобласці і ў Краснадары — на адлегласці ад нас каля дзвюх тысяч кіламетраў. Аб'ект у Краснадарскім краі вялікі і складаны, працуем вахтавым метадам.

Ёсць амбіцыйны праект па будаўніцтве ўнутрыкальцавой дарогі ў Магілёве. Ён разбіты на шмат этапаў, адзін з якіх ужо пройдзены — зроблены знос аўтазаправачнай станцыі па вуліцы Ленінскай. Рэалізацыя праекта разлічана не на адзін год, аб'ект вельмі цікавы. Ім прадугледжаны нетыповыя пуцявыя пераходы, эстакады. Такога ў Магілёве яшчэ не было.



Начальнік будаўнічага ўпраўлення Павел ЧЫЖОЎ.



Пешаходная зона на вуліцы Камсамольскай — узор гарадскога дызайну з выкарыстаннем сучасных матэрыялаў.



Маладыя рабочыя дарожна-будаўнічага трэста № 3 Аляксандр БЯЛЯЕЎ і Аляксандр ШАКУРЫН. Іх працоўная біяграфія толькі пачынаецца.



Добраўпарадкаванне пешаходнай зоны на праспекце Дзімітрава ў Магілёве.

## АЎТАМАБІЛІСТАМ НА ЗАМЕТКУ

**Спецыялісты МУС нагадваюць аб мерах бяспекі на дарогах з-за складаных умоў надвор'я. Пра гэта інфармуе тэлеграм-канал Міністэрства ўнутраных спраў.**

У ведамстве звярнулі ўвагу, што раніцай на дарогах краіны сітуацыю будуць ускладняць туманы, ападкі, чакаецца дрэнная бачнасць. У такіх умовах, адзначылі ў МУС, кіроўцам неабходна выконваць бяспечны хуткасны рэжым і дыстанцыю. Выбіраючы хуткасць руху, трэба зыходзіць са стану праезнай часткі і ўмоў бачнасці.

Кіроўцам аўтатранспартных сродкаў рэкамендуецца пазбягаць рэзкіх манеўраў і тармажэнняў, а рухацца з уключаным блізкім святлом фар або супрацьтуманнымі агнямі. Нагадваюць аб карыстанні рамянямі бяспекі. Асаблівую ўважлівасць, падкрэслілі ў ведамстве, варта праявіць пры праездзе пешаходных пераходаў.

У сваю чаргу пешаходам варта пераходзіць дарогу толькі ва ўстаноўленых месцах, пераканаўшыся ў бяспецы. А ў цёмны час сутак пазначаць сябе флікерамі.

**Сяргей КУРКАЧ.**




**Шаноўныя работнікі і ветэраны дарожнай галіны!**

*Прыміце шчырыя, сардэчныя віншаванні з прафесійным святам!*

*Дарога для любой краіны ва ўсе часы і эпохі гісторыі — адна з галоўных умоў дабрабыту і працвітання. Дарогі — неад'емная ўмова дзейнасці эканомікі, а значыць, і суверэнітэту. Якасцю дарог вызначаецца ўзровень развіцця дзяржавы, яны — залог далейшага яе росквіту, гарантыя асабістай бяспекі людзей, умова ўстойлівай работы бізнесу, сталых чалавечых стасункаў, дасягнення высокіх стандартаў у сферы паслуг. Нам важна мець магчымасць хутка даехаць да старых бацькоў у вёсцы, быць спакойнымі за дзяцей, якія адправіліся ў вандроўку, своечасова атрымаць неабходны груз і адправіць выраблену прадукцыю партнёрам. Ва ўсім гэтым, як і ў безлічы іншых сфер нашага жыцця, важную ролю іграе менавіта дарога — тое, наколькі яна якасная, сучасная, зручная, бяспечная, дагледжаная і добраўпарадкаваная.*

*Мы маем усе падставы ганарыцца за тое, што робім, і ў гэтым заслуга высокакваліфікаваных спецыялістаў, адказных рабочых дарожнай галіны.*

*Дарагія калегі! Ад усяго сэрца віншую вас з прафесійным святам! Жадаю здароўя, радасці ад зробленага, дабрабыту, міру!*

**Ад імя калектыву КУП «Віцебскаблдарбуд» генеральны дырэктар Уладзімір МАТВЕЕЎ.**

УНП 300003210.



***Сардэчна віншую калектыў РУП «Белдарсувязь» і ўсіх, хто мае дачыненне да прафесіі дарожніка, з прафесійным святам!***

***Цяжка ўявіць, якая вялікая праца праводзіцца, каб нашы дарогі былі бяспечныя, а іх абсталяванне — зручным для кіроўцаў і пасажыраў. Жадаю, каб на дарогах вам сустракаліся толькі пазітыў, спагада і поспех і асвятляліся яны ўсмешкамі і любоўю родных і блізкіх.***

**Дырэктар РУП «Белдарсувязь» Мікалай БІЧАН.**

УНП 190304566

Бацькаўшчына. У пошуках страчанага

# БРАСЛАЎСКАЕ СОНЦА

**Старыя паштоўкі з калекцыі Уладзіміра Ліхадзедава дазваляюць нам зрабіць віртуальную вандроўку ў любы куточак Беларусі. Асабліва багатыя на знаёмства з даўніной сустрэчы атрымліваюцца, калі збіраемся адкрыць гарады, паселішчы з багатай гісторыяй...**

Давайце ўгледзімся ў фатаграфічныя выявы Браслава. Старыя паштоўкі адкрываюць нам краявід з Замкавай гары ў 1930-я гады; рынак у Браславе, год 1918-ы; агульны від на мястэчка і касцёл Нараджэння Найсвяцейшай Дзевы Марыі (1930 год); прыстань на возеры Дрывяты; від на Замкавую гару з боку возера Навяты; само возера Дрывяты і дарогу на Опсу; староства ў Браславе ў 1930-я... Па трасе адлегласць ад Мінска да Браслава складае 237 кіламетраў. У вандроўку лепей за ўсё выпраўляцца на два дні. Самі мяркуйце: толькі ў адзін бок за тры гадзіны наўрад ці справіцеся... І ўвогуле спасцігаць новае і невядомае лепей няспешна.

Вядома, што Браслаў быў заснаваны князем Брачыславам Ізяславічам як умацаванне на мяжы Полацкага княства. Дзяцінец старажытнага паселішча — паміж азёрамі Дрывяты і Навята на Замкавай гары. У XI—XIII стагоддзях паселішча з'яўлялася памежным горадам Полацкага княства. У XIV стагоддзі вялікі князь Гедымін завяшчаў Браслаў малодшаму сыну Яўнуту. Бацька перадаў свайму нашчадку яшчэ Ашмяны і Вількамір (нагадаем, што сёння гэта — горад Укмярге, адзін з самых старажытных гарадоў Літвы).



Браслаў. Від на мястэчка і касцёл. 1930-я гады.

Але ж мы — лічы, у Браславе... Дарэчы, лёс Яўнута — сапраўдная мастацкая гісторыя. Можна смела здымаць кінафільм, узяўшы яго гістарычную біяграфію за аснову!.. Маючы непаразуменні з большасцю братоў, увайшоў у канфлікт з Альгердам і Кейстутам. Яны наладзілі супраць блізкага родзіча змову. Яўнут аказаўся ў сваіх братоў у палоне. Праз некаторы час нашчадак Гедыміна ўцёк з-пад варты. Праз Смаленск дабраўся да Масквы, дзе ў 1340—1353 гг. гаспадарыў яго швагер — князь Маскоўскі і вялікі князь Уладзімірскі Сямён Горды. Асоба, між іншым, легендарная. Знайшоўшы падтрымку ў Маскве, Яўнута прыняў праваслаўе. У 1347 годзе князь усё ж прымірыўся з братамі, вярнуўся ў родную старонку і стаў гаспадаром Заслаўскага княства, у якое тады ўваходзіў і Мінск.




Браслаў. Выгляд з Замкавай гары. 1930-я гады.

...У пачатку 1500-х гадоў у Браславе гаспадарыла жонка вялікага князя Аляксандра Ягелончыка — Алена. Яна заснавала на Замкавай гары жаночы праваслаўны манастыр. З 1500 года вядомы і Браслаўскі мужчынскі манастыр на востраве на возеры Неспіш. Возера — за чатыры кіламетры на ўсход ад Браслава. Паблізу вёскі Рубеж... Дарэчы, у 1517 годзе праз Браслаў праязджаў славуты славацкі дыпламат і падарожнік Сігізмунд фон Герберштэйн, аўтар «Запісак аб Масковіі» (твор іначай называюць «Запіскі пра маскоўскія справы»). Асобны раздзел гэтай надзвычай цікавай «падарожнай кнігі» — «Аб Літве». Сігізмунд фон Герберштэйн выступаў у 1517 годзе пасрэднікам на перагаворах паміж Масквой і Вялікім Княствам Літоўскім. З раздзела «Аб Літве» ў кнізе славацкага дыпламата: «Народ там прыгнечаны цяжкім рабствам». І ўвогуле — пра тагачасную Літву: «...бліжэй за ўсіх да Масковіі... Я гавару цяпер не пра адну толькі вобласць, але аб краінах, якія да яе прылягаюць і разумеюцца пад агульнай назвай Літва. Яна цягнецца доўгай паласой ад горада Чаркасы, які знаходзіцца каля Барысфена, аж да Лівоніі...» Нагадаем: Барысфен — ранейшая назва Дняпра...

Дарэчы, вельмі цікавым, прыкметным падаецца герб Браслава (сучасная яго выява зацверджана Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 20 студзеня 2006 года). У аснове — геральдычны сімвал з 1792 года: у блакітным полі залатое сонца, на якім блакітны трохвугольнік з чалавечым вокам — вокам Божага блаславення. Гэта агульнавядомы знак чароўнай сілы, альбо Тройцы. Вока — асэнсаванне таго, што Бог назірае за жыццём і дзеяннямі людзей. А трохвугольнік — трыадзінства Бога — Айца, Сына і Духа Святога. Сонца ж — старажытны сімвал жыцця, агню, які характарызуецца ачышчальнай сілай...

У сучасным Браславе шмат што ёсць паглядзець са славутых гістарычных аб'ектаў. Найперш звярніце ўвагу на Касцёл Нараджэння Найсвяцейшай Дзевы Марыі. Пабудаваны ў 1824 годзе. Рэканструкцыя мястэчка, які спраектаваны быў Клосам, яшчэ ў даваенныя гады напалову жартам Браслаў пачалі называць паўночнай Ніцай... Дарэчы, Юльюш Клос сябраваў, быў добра знаёмы са славутым мастаком Фердынандам Рушчыцам, які нарадзіўся ў Багданава, на Валожыншчыне. Архітэктар спраектаваў і драўляны касцёл Маці Божай Анёльскай у Мяжанах (аграгарадок Браслаўскага раёна)... А сучасны Свята-Панцеляймонаўскі жаночы манастыр знаходзіцца ў будынку былой земскай бальніцы (таксама помнік архітэктуры!). Закладка бальніцы адбылася 15 жніўня 1905 года. Першым урачом быў Станіслаў Нарбут (1853—1926), які карыстаўся надзвычай вялікім аўтарытэтам сярод мясцовага насельніцтва. У Першую сусветную вайну Станіслаў Нарбут узначальваў ваенна-медыцынскі лазарэт на Паўночна-Заходнім фронце. Быў цяжка паранены, доктару часткова ампутавалі нагу. Вярнуўшыся ў Браслаў, зноў пачаў




Браслаў. Рынак. 1918 год.

касцёла адбылася ў 1897 годзе. У мураўцы будынка быў выкарыстаны прыём браслаўскай мазаікі. У час Вялікай Айчыннай вайны пробашча касцёла Мечыслава Акрэйца фашысты расстралялі за тое, што хаваў яўрэяў. Да гісторыка-культурных каштоўнасцяў належыць і Свята-Успенская праваслаўная царква, пабудаваная ў 1897 годзе. А ў двары Дома культуры ў Браславе вы знойдзеце калодзежны шацёр. Гэтае драўлянае збудаванне 1924—1926 гг. таксама, між іншым, адносіцца да гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Аўтар стылізацыі народнага дойлідства — архітэктар Юльюш Клос (1881—1933), вядомы яшчэ як фатограф, гісторык архітэктуры. З-за ансамбля лячыць мясцовы люд. Пахаваны на Замкавай гары ў Браславе. Помнік пастаўлены ў 1927 годзе на сродкі, сабраныя жыхарамі паселішча. Яны і іх нашчадкі доўга трымалі ў памяці і тое, што земская бальніца была пабудавана на ўласныя сродкі доктара Нарбута...

Словам, вандруючы па старажытным гарадку, пераходзячы з адной вуліцы на другую, вы шмат што ўбачыце тут цікавага. А колькі цікавых дамкоў у Браславе!.. Не забудзьцеся іх сфатаграфаваць!..

**Кастусь ЛЕШНІЦА.**

*Паштоўкі з калекцыі лаўрэата Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» Уладзіміра Ліхадзедава.*

Суседзі

# Пірава перамога еўраскептыкаў

## Ці застанецца Польшча пасля выбараў «траянскім канём» ЗША

**Кіруючая партыя «Права і справядлівасць» Яраслава Качыньскага перамагла на парламенцкіх выбарах у Польшчы з вынікам 35,38 %, але не зможа самастойна сфарміраваць урад. Па выніках выбараў польская апазіцыя атрымала шанц сфарміраваць большасць у парламенце з-за таго, што ў электарату быў запыт на «свежае паветра».**

**Аб выбарах у суседзяў, аб новых тэндэнцыях, якія могуць з'явіцца ў палітычным жыцці Польшчы, мы пагаварылі з доктарам філасофскіх навук, прафесарам Львом КРЫШТАПОВІЧАМ.**



***— Леў Яўстаф'евіч, як бы вы ахарактарызавалі цяперашнюю перамогу на парламенцкіх выбарах партыі Яраслава Качыньскага, калі параўнаць яе з двума папярэднімі электаральнымі цыкламі — 2015, 2019 гадоў, дзе перамога аказалася абсалютнай?***

— Гэтым разам ПіС перамагла на выбарах з вынікам 35,38 %. А ці зможа яна сфарміраваць урад ва ўмовах, калі складваецца апазіцыйная большасць? Адна справа — атрымаць лічбы на выбарах, але іншая — якой будзе раскладка палітычных сіл апазіцыі. Тут трэба мець на ўвазе, што адносная перамога партыі Яраслава Качыньскага, па сутнасці, кансерватыўнай, партыі еўраскептыкаў, не дае ёй большасці ў парламенце. Такім чынам, узнікае праблема фарміравання ўрада ад партыі ПіС. Аб'яднанне апазіцыйных сіл мае ўсе шанцы скласці большасць у парламенце і прапанаваць свайго прэм'ера.

**— Эксперты часам называюць гэтую перамогу «піравай». Ці дарэчы гэтае параўнанне?**

— Чаму б і не? Выраз пайшоў ад таго выпадку, калі Пір у барацьбе з рымлянамі перамог з вялізнымі стратамі. І сам прызнаўся, што калі б яшчэ адна такая перамога, ад яго войска нічога б не засталося. Так і з сітуацыяй у Польшчы. Партыя, якая перамагла на выбарах, не можа лічыцца рэальным пераможцам. З яе рук, хутчэй за ўсё, выслізне ўлада, чаго ПіС больш за ўсё баіцца.

***— Вы згодны з ацэнкай поствыбарнай сітуацыі ў Польшчы, якую даюць аналітыкі?***

— Многія журналісты, эксперты, аналітыкі ў ацэнцы гэтых падзей кажуць пра нейкі гістарычны паварот, які здарыўся ў Польшчы ў выніку выбараў, што тут пацярпелі паражэнне еўраскептыкі і перамаглі еўрааптымісты, разважаюць пра новую тэндэнцыю, якая фарміруецца ў Польшчы. На маю думку, гэта ўсё павярхоўныя меркаванні. Для таго каб зразумець польскую сітуацыю цяпер і палітыку кіруючай эліты Польшчы, трэба разабрацца ў паводзінах польскай «шляхты». «Шляхтай» я называю эліту не ў сэнсе нейкага сярэднявечнага саслоўя. Гэта абагульняльнае абазначэнне польскага вышэйшага класа — інтэлектуалаў, эшалона ўлады, журналістаў, палітыкаў, гісторыкаў, палітолагаў, якія вядуць свой палітычны і гістарычны радавод менавіта ад польскай шляхты. А польская шляхта ў ментальным і гістарычным сэнсе характарызуецца пэўным наборам такіх якасцяў і такога палітычнага прынцыпу, які заўсёды ішоў уразрэз з інтарэсамі ўласна польскага народа. Гэты прынцып вядомы — ліберум вета. Ён сфарміраваўся ў Рэчы Паспалітай у XVI—XVII стагоддзях, XVIII стагоддзе — яго росквіт. Сэнс яго заключаўся ў тым, што польскі шляхціц, выступаючы на сейме, мог прагаласаваць супраць прыняцця нейкага рашэння і яно не прымалася — так званае «не дазволю». І вось гэтая канструкцыя польскай палітычнай сістэмы вырасла ў ментальнасць польскага кіруючага класа. Хоць заканадаўча гэта даўно адменена, у ментальнасці захоўваецца той жа прынцып ліберум вета: што хачу, тое і лічу сапраўдным, як у палітыцы, так і ў гісторыі. У гэтым сэнсе і сённяшняя праблема Польшчы заключаецца ў тым, што яе кіруючы клас, эліта фактычна хоча навязаць сваё разуменне самой Польшчы і яе палітыкі і таго, як павінны паводзіць сябе суседнія дзяржавы з пункту гледжання гэтага яе падыходу — ліберум вета.

***— Апазіцыя ў выніку выбараў атрымала шанц сфарміраваць большасць у парламенце з-за таго, што ў электарату быў запыт на «свежае паветра». У чым іх пазіцыя?***

— Найбуйнейшае апазіцыйнае аб'яднанне «Грамадзянская платформа» атрымала па колькасці галасоў другое месца. Разам з кааліцыяй «Трэці шлях», аб'яднаннем «Канфедэрацыя» маглі б нешта змяніць. «Свежае паветра» электарат чакаў менавіта ад апазіцыі. Ядро электарату апазіцыйнай часткі — гэта больш маладзёжная публіка, мабільная, якой не імпанавала рэтраградная палітыка партыі Яраслава Качыньскага і ўрада, пабудаваная на канфрантацыі, якая не цуралася агрэсіўных выпадаў супраць Расіі, супраць нашай краіны, напампоўвала Польшчу зброяй і трызніла вайной, прычым на сур'ёзным узроўні. Замест таго, каб падтрымліваць ваенныя выдаткі на ўзроўні 2 % ад ВУП, як патрабаваў Еўрасаюз ад сваіх краін, Польшча ўжо цяпер мае лічбу больш за 3,5 % з арыентацыяй на 4 %. Гэта не магло выклікаць згоды з боку больш рацыянальнай, больш разумнай часткі польскага грамадства. Апаненты ўлады лічылі, што такая палітыка можа завесці Польшчу ў тупік і ўвогуле можа прывесці да самых сумных, трагічных вынікаў для краіны.

***— Як могуць паўплываць вынікі парламенцкіх выбараў у Польшчы на яе знешнюю палітыку, у прыватнасці на стаўленне да Беларусі і Расіі?***

— Не варта перабольшваць значэнне вынікаў у тым плане, што пасля выбараў нешта рэальна зменіцца ў плане знешняй палітыкі. Ды і ў плане ўнутранай палітыкі вялікае пытанне. Дональд Туск можа ўзначаліць урад, але наўрад ці атрымаецца адмяніць тыя антыеўрапейскія рашэнні ранейшага ўрада. Ды і ў кааліцыі апазіцыйнай большасці не ўсе саюзнікі. Ёсць ваганні. Складанасць уяўляе дзяленне партфеляў ва ўрадзе на траіх, а менавіта так сітуацыя складваецца. Некаторыя па балючым пытанні забароны абортаў займаюць дваістую пазіцыю, лічаць, што гэтае становішча можа заставацца. Іншыя па міграцыйных пытаннях наўрад ці гатовы рабіць рэзкія рухі, мяняць тое, што прынята ранейшай уладай. Вядома, ва ўнутранай палітыцы найбольш адыёзныя моманты, якія характарызавалі дзейнасць партыі ПіС, недзе стануць больш мяккімі, а можа, і адменяцца. Што датычыцца сутнаснай палітыкі ўнутры краіны — яна не зведае сур'ёзных змен. А ў галіне знешняй палітыкі ўвогуле змен не чакаецца. Проста Дональд Туск як прызнаны еўрапейскі лідар зойме больш талерантную, больш рацыянальную пазіцыю ў правядзенні палітыкі Польшчы ва ўсходнім напрамку. Тым не менш гэта палітыка будзе ісці ў антырасійскім і антыбеларускім рэчышчы. Гэта зноў жа вынікае з ментальнасці польскай кіруючай эліты. Яна разглядае дзейнасць ва ўсходнім напрамку так, што гэта яе вотчына, усе яе рэкамендацыі павінны выконвацца. Асаблівасць сёння ў тым, што партыя Яраслава Качыньскага мае арыентацыю на ЗША. Гэтую краіну лічаць гарантам яе дзейнасці. Таму невыпадкова дальнабачныя еўрапейскія палітыкі, напрыклад, Жак Шырак у свой час прама казаў, што Польшча — траянскі конь Злучаных Штатаў у Еўрасаюзе. У гэтым кантэксце і трэба разглядаць Польшчу. Але паколькі Еўрасаюз — не столькі суб'ект геапалітычны, колькі падпарадкаваны саюзнік ЗША, то, такім чынам, прынцыпова ў знешняй палітыцы Польшчы нават з прыходам да ўлады Дональда Туска нічога не зменіцца для нашай краіны і для Расіі. Гэта маё меркаванне.

***— «Грамадзянская платформа» пад кіраўніцтвам Дональда Туска набрала 30,7 % галасоў. Але ёсць і іншыя палітычныя партыі, якія пераадолелі пяціпрацэнтную мяжу і ўвайшлі ў парламент...***

— У парламент увайшоў і цэнтрысцкі «Трэці шлях» — 14,4 % галасоў. Левыя — 8,61 % галасоў. Кааліцыя нацыяналістаў і еўраскептыкаў «Канфедэрацыя» — 7,16 % галасоў. Такім чынам, складаецца электаральная палітра сёлетніх выбараў у Польшчы. За кошт чаго такая атрымалася раскладка? З-за высокай яўкі на выбары: 74 %. Апазіцыі ўдалося прыцягнуць на выбары маладых людзей да трыццаці гадоў. Гэта заслуга «Трэцяга шляху» і левых, якія выступілі для выбаршчыкаў «свежым паветрам». На іх нейкая надзея ўскладалася. Трэба мець на ўвазе, што ўнутраная палітыка кіруючай партыі — сацыяльная, культурная, рэлігійная — была недасканалай, адыёзнай, рэакцыйнай нават з пункту гледжання тых фармальных прынцыпаў, якія абвяшчаюцца ў дакументах Еўрасаюза: падзел улад, вяршэнства права і іншыя. Такія актуальныя рэчы для Польшчы, як забарона абортаў, нават тых, якія звязаны з паталагічнымі выпадкамі, медыцынскім прадпісаннем, не выклікала задавальнення з боку польскіх выбаршчыкаў, маладых жанчын, юнакоў. Трэба мець на ўвазе вялікі ўплыў касцёла, нават умяшанне яго ў палітыку, у свецкае жыццё людзей. Партыя ПіС нават выкарыстоўвала выяву Яна Паўла Другога ў сваёй выбарчай кампаніі, падводзіла да таго, што нібыта ён з'яўляецца апекуном гэтай партыі. У саміх касцёлах агітавалі за партыю Качыньскага. Тут шмат такіх момантаў, якія ішлі насуперак тым фармальным прынцыпам, якія дэкларуюцца ў Еўрасаюзе як непадпарадкаванне ім.

***— Напярэдадні парламенцкіх выбараў у Польшчы беларускія журналісты зрабілі магутны дакументальны фільм «Чацвёртая Рэч Паспалітая». Калі б ён быў на польскай мове і паказаны ў Польшчы, гэта была б палітычная бомба. Там раскрыты прэтэнзіі Польшчы і заяўка на ролю чацвёртай Рэчы Паспалітай — і гэта актуаліі сённяшняй знешняй палітыкі суседзяў.***

— Анджэй Дуда на поўным сур'ёзе публічна заяўляў аб тым, што ўсходнія задачы Польшчы павінны вырашацца ў тым плане, каб вярнуць свае страчаныя тэрыторыі. Іншымі словамі — стварыць чацвёртую Рэч Паспалітую. Гэта пацвярджаюць адносіны Польшчы і Украіны. Эксперты зацыкліваюцца на дыскусіях і ўзаемных папроках наконт збожжавай здзелкі і паставак іншых сельгаспрадуктаў. А насамрэч польская шляхта і цяперашняя неабандэраўская група, якая кіруе ва Украіне, — гэта браты назаўжды. У іх пакуль разыходжанні чыста кан'юнктурна-палітычныя, эканамічныя і іншыя. Інтарэсы геапалітычнага плана адны і тыя ж — гэта нянавісць да Расіі, нянавісць да таго, што ляжыць на ўсход ад Польшчы. Гэта іх аб'ядноўвае гістарычна. Дагаворы, якія падпісаны Анджэем Дудам і Уладзімірам Зяленскім, сведчаць аб імкненні да стварэння саюзнай дзяржавы Польшчы і Украіны. Усё гэта пры ўзгадненні з ЗША. Зяленскі падпісвае ўсё, што яму загадаюць з Вашынгтона. А па сваёй ментальнасці Зяленскі — гэта своеасаблівы мазепавец. У Пушкіна ў паэме «Палтава» езуіт, які з польскімі князямі каваў змову супраць Расіі, мае прозвішча Заленскі (яго аўтар называе адным з галоўных агентаў мазепавай здрады). Як цікава гісторыя высвецілася. Пушкін убачыў, што гэта магчыма ў будучыні — своеасаблівы езуіт-бандэравец сёння робіць усё, што яму загадаюць з-за акіяна. Ён не самастойны. У адрозненне ад польскай шляхты, якая лічыць сябе самастойнай і падае версію стасункаў з Украінай такім чынам: перамога Украіны над Расіяй у інтарэсах Польшчы. Таму яны заплюшчваюць вочы на трагічныя падзеі, звязаныя з валынскай разнёй. Яны не жадаюць узнімаць гэтую тэму, паколькі тым самым агаляецца ненатуральнасць іх альянсу з паслядоўнікамі бандэраўцаў. Польскі ўрад і сейм прынялі закон, што гэта генацыд супраць грамадзян другой рэспублікі Польскай, тым не менш гэта замоўчваюць.

***— У Польшчы пасля выбараў склалася палітычная нявызначанасць. Што пад гэтым разумеецца?***

— Па-першае, прэзідэнтам краіны застаецца актыўны дзеяч партыі «Права і справядлівасць», стаўленік Яраслава Качыньскага Анджэй Дуда. Згодна з Канстытуцыяй краіны, пасля абвяшчэння вынікаў выбараў у парламент прэзідэнт уносіць кандыдатуру прэм'ер-міністра, які, у сваю чаргу, прапануе кандыдатаў на міністэрскія пасады. Пасля сейм разглядае пытанне аб вотуме даверу гэтаму ўраду. Ён выносіцца абсалютнай большасцю галасоў у прысутнасці не менш як паловы спісачнага складу дэпутатаў. Таму можна сапраўды лічыць, што парламенцкія выбары ўвялі краіну ва ўнутрыпалітычную нявызначанасць. Атрымліваецца, што партыя ПіС Яраслава Качыньскага набрала найбольшую колькасць галасоў сярод усіх удзельнікаў выбарчай кампаніі, але апазіцыйныя партыі разам набралі больш за палову галасоў. Калі яны здолеюць аб'яднацца ў кааліцыю, то атрымаюць шанц сфарміраваць урад і адхіліць ад улады ПіС. Роля прэзідэнта цяпер можа быць вызначальнай. Нельга выключыць таго, што перманентны парламенцкі крызіс можа стаць цалкам рэальным. Анджэй Дуда можа прапанаваць прэм'ера з партыі ПіС. Апазіцыя будзе рэкамендаваць і адстойваць кандыдатуру Дональда Туска. Парламент яго можа зацвердзіць, ён можа прапанаваць міністраў, але прыняцце законаў будзе ўскладняцца. Каб закон прайшоў, ён павінен не толькі быць прыняты парламентам, але і падпісаны прэзідэнтам. Каб пераадолець вета прэзідэнта, неабходна не простая большасць, а дзве трэці галасоў, чаго ў кааліцыі не будзе. І гэта можа працягвацца бясконца. Такі магчымы лёс Польшчы.

Канешне, унутраная і знешняя палітыка наўрад ці зменіцца і на міжнародных пазіцыях Польскай Рэспублікі змен не прадбачыцца. У прыватнасці, ва ўкраінскім пытанні і ў адносінах да Расіі і нашай краіны. У гэтых сферах кіруючая партыя «Права і справядлівасць» і апазіцыйная «Грамадзянская платформа» прытрымліваюцца аднолькавых поглядаў.

**Гутарыў Леанід НОВІКАЎ.**

# Збіральнікі і паляўнічыя

## Філатэлісты, нумізматы, фалерысты...

Першае аб'яднанне калекцыянераў з'явілася ў Беларусі ў далёкім 1958 годзе, расказвае Барыс Анатольевіч. Да 1979 года яно аб'ядноўвала ў асноўным філатэлістаў — людзей, якія калекцыяніруюць маркі. А ў 1980-м утварылася Мінскае рэгіянальнае аб'яднанне калекцыянераў, якое ў далейшым і пераўтварылася ў Беларускае рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне калекцыянераў. Калі гаворка ідзе пра прыватныя калекцыі, хутчэй за ўсё, у неспецыяліста ўзнікаюць асацыяцыі з палотнамі знакамітых жывапісцаў коштам у мільярды долараў. Ну, або з калекцыяй марак з уласнага дзяцінства. Насамрэч разнавіднасцяў кірункаў калекцыяніравання існуюць дзясяткі. Філатэлісты збіраюць маркі і паштовыя адпраўленні, нумізматы — грашовыя знакі (манеты і «папяровыя» грошы), філакартысты — паштовыя карткі і паштоўкі, фалерысты — медалі і значкі, прасафілісты — уявіце сабе, прасы. Апошніх не варта блытаць з прэсафілістамі: амаль цёзкі калекцыяніруюць старыя газеты і часопісы. Самыя экзатычныя кірункі калекцыяніравання — напрыклад, цэгла (так, цагліны таксама могуць стаць асновай найцікавай калекцыі). Або фігуркі анёлаў. Або статуэткі катоў... У Мінску ёсць жанчына, у калекцыі якой больш за пяць тысяч фігурак катоў, а ў Барысаве яшчэ адна дама-калекцыянер сабрала ўнікальную калекцыю з больш як 3000 лялек, у кожнай з якіх свая гісторыя (прычым некаторыя экзэмпляры нашмат старэйшыя за сваю цяперашнюю гаспадыню).

— Калі чалавек уступае ў наша аб'яднанне, мы даём яму памятку, — кажа Барыс Анатольевіч. — У ёй указаны 88 кірункаў калекцыяніравання. Але звычайна інтарэсы калекцыянераў ляжаць не ў адным, а ў некалькіх кірунках — такіх мы аб'ядноўваем у секцыю поліфілістаў, і іх у нас каля паловы.

На сёння, расказвае суразмоўца, аб'яднанне налічвае каля 600 чалавек. Але гэта не адзіная супольнасць калекцыянераў у краіне. Напрыклад, ёсць клуб калекцыянераў «Юнона» ў Гомелі, ёсць ГА «Беларускі саюз філатэлістаў», ёсць буйны нумізматычны клуб «Скарбонка» ў Гродне і г. д. А больш за ўсё калекцыянераў пражывае ў Брэсце — там у рэспубліканскага аб'яднання вялікая абласная секцыя.

Рэгіянальныя злёты аб'яднанне праводзіць штогод, але рэспубліканскія ў сталіцы і з гасцямі з-за мяжы — раз на пяцігодку. Так што нам пашанцавала. Тым больш што сёлета ў калекцыянераў аншлаг.

— Не ўсім ахвотным хапіла сталоў для іх калекцый, — кажа старшыня праўлення БелРГАК. — Шчыра кажучы, не чакалі такога наплыву ўдзельнікаў — з усіх рэгіёнаў краіны, плюс замежныя госці, у тым ліку калекцыянеры з Масквы, Смаленска.

## Асаблівы свет

Што прымушае людзей збіраць што б там ні было? Знаходзіць час, сілы і фінансы на папаўненне калекцыі?

— Тут сукупнасць прычын, — тлумачыць Барыс Васільеў. — Пачынаецца ўсё з таго, што нейкі прадмет чалавеку проста падабаецца. Але потым, калі казаць аб сур'ёзных калекцыях, прыходзіць этап удумлівай гістарычнай працы. Усіх нас, калекцыянераў, аб'ядноўвае любоў да гісторыі ў спалучэнні з уменнем бачыць і адчуваць прыгажосць. Над стварэннем марак, манет, медалёў і ордэнаў заўсёды працуюць спецыялісты — там свае законы, свая графіка, свая прыгажосць... Адна з нашых задач — паказаць гэтую прыгажосць людзям, навучыць іх заўважаць і разумець яе. Іншымі словамі, зрабіць калекцыю камунікатыўнай. Зацікавіўшыся, калекцыянер пачынае вывучаць гістарычныя матэрыялы, працаваць у бібліятэках і архівах, бо сістэматызацыя калекцыі — вялізная праца. А нядаўна ў нас быў такі выпадак: калекцыянер з Брэста набыў медаль і, вывучаючы яго гісторыю, знайшоў чалавека ў Кыргызстане, які быў узнагароджаны гэтым медалём. Праз пасольства мы перадалі гэты медаль яго сваякам...

«Які ж музей без нездаровага інтарэсу? Здаровы інтарэс бывае толькі да вяндліны», пісаў Сяргей Даўлатаў. Сапраўды, калекцыяніраванне — свайго кшталту «хвароба», усміхаючыся, пацвярджае суразмоўца. І сапраўды, часта прыватныя калекцыі людзі перадаюць у музеі.

— Як любое сур'ёзнае хобі, гэта зацягвае, гэта асаблівы свет. Калі трымаеш у руках рэч, якой 200—300 гадоў, далучаешся да гісторыі. Магу дакладна сказаць: у старажытных прадметаў ёсць душа, асаблівая аўра, якую можна адчуць. Любы прадмет з калекцыі захоўвае ў сабе пэўныя эмоцыі. І гэта прыносіць радасць.

Калекцыяніраванне — хобі інтэлектуалаў. Многія знакамітыя навукоўцы былі схільныя да гэтага захаплення. І многія музейныя калекцыі некалі пачаліся менавіта з калекцый прыватных. Гэтую традыцыю беларускія калекцыянеры працягваюць.

— Мы такія акцыі праводзім рэгулярна: перадаем у розныя музеі Беларусі экспанаты ад брэсцкіх калекцыянераў, — кажа **старшыня Брэсцкай рэгіянальнай секцыі калекцыянераў БелРГАК Сяргей ВАЛЯЕЎ.**

— І менавіта прыватная калекцыя паклала пачатак вельмі цікаваму музею прыватнага калекцыяніравання ў Віцебску, — дадае Барыс Васільеў. — Свежы прыклад: літаральна днямі мы ўзнагародзілі нашага самага тытулаванага на сёння калекцыянера, Арлова Аляксандра Пятровіча, які больш за 65 гадоў збіраў рэдкія манеты. Сваю калекцыю ён падарыў у Дзень горада Музею гісторыі Мінска. Сёння яна экспануецца ў ратушы. А ў цэлым цяпер па ўсёй Беларусі экспануем каля дзесяці калекцый нашага аб'яднання.



**Старшыня Брэсцкага абласнога аб'яднання ГА «Беларускі саюз філатэлістаў» Леанід ТУРЫН.**

## Аб кошце і каштоўнасці

Адкуль калекцыянер бярэ рэдкія экземпляры патрэбных яму, часам дзіўных (як, скажам, старадаўнія праязныя білеты) рэчаў, якія не загінулі ў бурным моры гісторыі? Бо ні ў адной краме такога не купіш...



**Паштоўкі, канверты і маркі могуць «расказаць» нямала гісторый.**

— Інтэрнэт-рэсурсы, аўкцыёны — іншага шляху няма, — тлумачыць Барыс Васільеў. — Гэта і Поле цудаў так званае, дзе нешта можна знайсці. Хоць усё залежыць ад прадмета калекцыяніравання — дарагія рэдкія манеты, напрыклад, на барахолцы прадаваць ніхто не будзе.

Кожны калекцыянер адкрывае крыніцы папаўнення калекцый для сябе сам. Працуе ў бібліятэках і архівах, каб разумець, якія рэчы ўяўляюць гістарычны інтарэс, а якія — не. Мае стасункі з калекцыянерамі ў нашай краіне і па ўсім свеце.

Ну, а можа проста пашанцаваць. Напрыклад, калекцыянер з Мінска Андрэй Пелы расказвае, як яму дасталіся некалькі газет часоў Вялікай Айчыннай вайны, якія выпускаліся ў партызанскіх атрадах.

— У кожным раёне быў свой падпольны райкам партыі, і кожны выпускаў газету. Тыражы такіх газет былі вельмі маленькімі. І вось у нашы дні людзі разбіралі старую хату і на гарышчы знайшлі пачак такіх газет. Так бывае.

Каштаваць калекцыі могуць па-рознаму: ад ста рублёў да сотняў тысяч долараў. Ну, а для кожнага калекцыянера яго калекцыя — каштоўная і неацэнная.

— Камусьці ўсё гэта каштоўна, а для кагосьці нічога не варта. Напрыклад, старымі газетамі або плакатамі людзі, не паглядзеўшы і не разабраўшыся, могуць і печку распаліць, на жаль, — кажа Андрэй.

Ну, а калі казаць аб аб'ектыўным кошце такіх экспанатаў, то каштоўнасць манеты, напрыклад, залежыць ад тыражу — чым ён быў менш, тым больш рэдкай з'яўляецца рэч. Брак або памылка друку на манеце ці «паперцы» павышае каштоўнасць экспаната, распавядае Сяргей Валяеў (яго сфера інтарэсаў — якраз нумізматыка).

Або вось вам задачка: у Савецкім Саюзе некалі была выпушчана серыя паштовых марак наміналам 1 капейка, 2, 4, 10 і 20 капеек. Якая з іх будзе самай рэдкай і найбольш каштоўнай для філатэліста?

— Самай рэдкай з марак у дадзеным выпадку будзе тая, што за 4 капейкі, — тлумачыць Барыс Васільеў. — Чатыры капейкі — гэта быў тарыф на адпраўленне ліста, гэтыя маркі клеіліся на канверты і знікалі разам з імі, выкідваліся. Таму сёння іх захавалася мала. А маркі па 20 капеек засталіся на руках.

Чым менш захавалася марак, тым вышэйшы іх кошт — часам ён можа даходзіць да тысяч долараў у эквіваленце. І перш чым быць прададзенай або набытай, такая марка праходзіць экспертызу — бо трэба ж быць упэўненым, што рэч сапраўдная. З дапамогай мікраскопаў і спецыяльных прыбораў ацэньваюцца колькасць зубцоў, якасць паперы, іншыя параметры.

## Адбітак у душы

Калекцыя ўяўляе цікавасць, калі праз прадметы глыбока раскрываецца нейкая тэма, кажуць калекцыянеры.

— Напрыклад, калі я пачуў пра калекцыю праязных білетаў, адразу падумаў, што гэта не надта цікава, — распавядае Барыс Васільеў. — Але потым, пазнаёміўшыся з пытаннем і паглядзеўшы відэа гэтага калекцыянера на «Ютубе», зацікавіўся. Унікальная калекцыя, сабраная ім, расказвае гісторыю развіцця грамадскага транспарту. Ён валодае найцікавейшымі гістарычнымі звесткамі, а яго калекцыі пазайздросціць любы музей транспарту. Уласна, яго калекцыя — гэта ўжо гатовая музейная экспазіцыя.

Прыклад сур'ёзнай гістарычнай працы — калекцыя марак **старшыні Брэсцкага абласнога аб'яднання ГА «Беларускі саюз філатэлістаў» Леаніда ТУРЫНА,** прысвечаная бітве пад Масквой у 1941 годзе.

— Калекцыя заўсёды патрабуе вялікай працы, — распавядае ён. — Некаторыя з калекцыянераў нават абараняюць дысертацыі па гісторыі на аснове сваіх калекцый.

У калекцыі Леаніда Рыгоравіча, якую ён прывёз на злёт, каб зрабіць тэматычную выставу, — канверт з выявай Жукава, выпушчаны яшчэ пры жыцці Маршала Перамогі, а таксама картмаксімум «Парад на Краснай плошчы 7 лістапада 1941 года» — рэдкая рэч музейнай каштоўнасці. І ўнікальная марка з выявай станцыі метро «Маякоўская», дзе ў 1941 годзе праходзіла ўрачыстае пасяджэнне ўрада перад 7 лістапада.

— А гэты раздзел калекцыі прысвечаны Рыхарду Зорге, — кажа Леанід Рыгоравіч. — Калі спытаць сто сучасных падлеткаў, хто гэта такі, адкажуць, думаю, чалавекі два ці тры. Між тым дзякуючы яму 16 дывізій з Далёкага Усходу былі перакінутыя пад Маскву ў 1941 годзе, і, можа, менавіта гэты крок шмат у чым вызначыў перамогу савецкіх войскаў. Аб Зорге ўспомнілі толькі ў 1965 годзе, і тады выйшла марка, прысвечаная яму. Вось яна. А гэта — блок (гэта значыць, вялікая марка), які быў выпушчаны ў ГДР.

Суразмоўца кажа, што праз філатэлію можна далучаць моладзь да больш глыбокага вывучэння гісторыі сваёй краіны.

— У канцы верасня дзякуючы садзейнічанню РУП «Белпошта» мы правялі ў Брэсце юнацкую выставу «Юніфіл-2023», — распавядае ён. — Многія дзеці збіраюць маркі, трэба іх проста арганізаваць. Было ўрачыстае адкрыццё з удзелам міністра сувязі і інфарматызацыі Канстанціна Шульгана, былі мэр горада і прадстаўнікі аблвыканкама, былі замежныя госці — з Расіі, Арменіі. Госці былі вельмі ўражаныя ўзроўнем арганізацыі мерапрыемства — за гэта дзякуй, вядома, «Белпошце».

Леанід Турын адзначае, што сярод калекцый моладзі ён вылучыў бы сабраную студэнткай каледжа Ганнай Баюрай (яна працавала над ёй разам з дзядулем). Калекцыя картак, канвертаў, значкоў і медалёў прысвечана Брэсцкай крэпасці. Як чалавек выбірае тэму для сваёй калекцыі? Нешта з прачытанага або ўбачанага на экране пакінула адбітак у душы. Або нешта проста адгукаецца радасцю ў сэрцы. Самая юная ўдзельніца X злёту калекцыянераў Беларусі, Варвара Міхасёнак, прывезла з Маладзечна частку сваёй калекцыі фігурак коней. Кажа, захапілася верхавой яздой — і адначасова пачала збіраць такія фігуркі. Цяпер у яе іх каля 60, і калекцыя будзе расці.

— Як наведвальнікі і сур'ёзныя калекцыянеры ставяцца да тваёй калекцыі?

— Па-рознаму. У кагосьці яна выклікае здзіўленне, нехта абыякава праходзіць міма. Я не крыўдую, стаўлюся па-філасофску. Хтосьці нават супраць такой несур'ёзнай калекцыі: кажа, не траць на гэта грошы, купі лепш што-небудзь патрэбнае. Але большасць мяне разумеюць. Бо калі я прадам або вырашу падараваць некаму фігуркі з сваёй калекцыі коней, я буду сумаваць. Не магу з імі развітацца!

**Дзіяна РОНІНА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

**Садова-агародны сезон скончыўся. Самы час прыгадаць ураджайнасць ягадных культур, культур пладовых і гародніны. Давайце на фоне гэтага паспрабуем спрагназаваць ураджай на наступны год.**

# ПРАГНАЗУЕМ БУДУЧЫ ЎРАДЖАЙ



### Маліны і суніцы садовыя

У пачатку сезона суніцы садовыя прыхапіла марозам, але гэта не перашкодзіла ім даць вельмі добры ўраджай. Значыць, з высокай доляй верагоднасці і на наступны год ён будзе добры.

Ад хвароб у мінулым сезоне суніцы пакутавалі не больш, чым раней, аднак вельмі актывізаваўся сунічны даўганосік, таму з пачаткам цёплага сезона наступнага года трэба правесці прафілактычныя апрацоўкі інсектыцыдамі.



Маліна таксама парадавала нядрэнным ураджаем, аднак не абышлося без пурпурнай плямістасці. Улічваючы гэта, увесну, да таго як маліна пачне цвісці, неабходна правесці пару апрацовак фунгіцыдам.

### Парэчкі і агрэст

Абедзве гэтыя культуры былі дастаткова ўраджайныя. Праўда, пераж͏ыла цёплую зіму шклянніца, якая атакавала кусты парэчак. У бягучым сезоне на ўраджаі гэта не адбілася, але вось у наступным годзе парэчак можа быць менш.

Унясіце зараз пад абедзве культуры па 10 г сульфату калію і суперфасфату, а рана вясной апрацуйце кусты «Фуфанонам».

### Абрыкосы і персікі

На жаль, абрыкосы парадавалі ўраджаем не ўсюды — вясновыя маразы загубілі частку кветак. У некаторых рэгіёнах пацярпелі нават маладыя прыросты, таму ў будучым сезоне ўраджаі могуць быць сціплымі.

Персікі таксама пацярпелі ад марозу, але ў тых рэгіёнах, дзе яго не было, галінкі проста ламаліся ад ураджаю, гэта значыць, што на наступны сезон ураджаі будуць больш сціплымі — расліны будуць адпачываць.

### Чарэшня і вішня

Сёлета яны таксама пацярпелі ад зваротных замаразкаў, але ўраджаі не былі ніжэй, чым звычайна. Калі ў будучым сезоне маразоў у маі не чакаецца, то плануецца нядрэнны ўраджай.



Важна правесці прафілактычныя апрацоўкі ад маніліёзу (3 % медным купарвасам) і вішнёвай мухі.

### Вінаград

Надвор'е ў верасні дазволіла парасткам добра выспець, значыць, на наступны год можна чакаць добрай ураджайнасці.

Важна цяпер помніць аб тым, як добра накрыць вінаград, а перад хованкай лазы старанна апрацаваць 1 % жалезным купарвасам, гэта абароніць як лозы, так і пупышкі ад грыбной інфекцыі, ад выправання.

Калі ўсё зробіце правільна, то ўраджай павінен быць нядрэнны.

### Яблыні і грушы

Большая частка сартоў парадавала добрым ураджаем, бо летась яны, можна сказаць, адпачывалі.

Не забудзьцеся правесці санітарнае абразанне і апрацаваць расліны 2 % медным купарвасам, гэта ж датычыцца і груш, тады добрага ўраджаю ў наступным годзе вам не пазбегнуць.

## Даты. Падзеі. Людзі

### 26 КАСТРЫЧНІКА

**У краіне**

**1903** год — нарадзіўся Мікалай Афанасьевіч Герасімаў, беларускі празаік.

**1923** год — нарадзіўся (Хоцімскі раён) Сяргей Агафонавіч Лупікаў, поўны кавалер ордэна Славы. У Вялікую Айчынную вайну быў на фронце з 1943-га. Памочнік камандзіра разведузвода сяржант Лупікаў вызначыўся ў баях за вызваленне Польшчы. У жніўні 1944-га ў баях за крэпасць Асавец фарсіраваў раку, правёў разведку агнявой сістэмы праціўніка. У лютым 1945-га замяніў камандзіра ўзвода, за тры дні баёў узвод на чале з Лупікавым захапіў дзве гарматы, чатыры кулямёты, узяў у палон 172 гітлераўцаў. У сакавіку 1945-га ўзвод Лупікава ноччу разведаў пераправы праз раку Ісача ў чатырох месцах, што садзейнічала прарыву абароны і ўступленню савецкіх войскаў каля горада Гдыня, захапіў тэрыторыю авіязавода і ўзяў у палон 50 гітлераўцаў.



**1953** год — нарадзіўся Віктар Іосіфавіч Чапялёў, акцёр, рэжысёр, заслужаны артыст Беларусі. Працаваў у Магілёўскім абласным драматычным тэатры, Магілёўскім абласным драматычным тэатры імя В. Дуніна-Марцінкевіча (Бабруйск). З 1985-га — акцёр, з 2010-га — дырэктар — мастацкі кіраўнік Гомельскага абласнога драматычнага тэатра. Паставіў шэраг спектакляў.

**2018** год — памятны знак да 55-годдзя студатрадаўскага руху Беларусі і 100-годдзя УЛКСМ адкрылі на тэрыторыі Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта ў Мінску.

**У свеце**

**1842** год — нарадзіўся Васіль Васільевіч Верашчагін, рускі мастак, аўтар нарысаў. У гісторыю рускага жывапісу ўвайшоў як яркі мастак-баталіст, які ўпершыню паказаў салдат як галоўную сілу ваенных падзей, салдацкую мужнасць і іх цяжкую армейскую працу. Аўтар карціны «Апафеоз вайны», серыі «Варвары» і інш. Загінуў 31 сакавіка 1904-га пры выбуху браняносца «Петрапаўлаўск» у Порт-Артуры.

**1908** год — нарадзіўся Барыс Аляксандравіч Смірноў, расійскі акцёр тэатра і кіно, народны артыст СССР. Іграў у ленінградскіх тэатрах, у Маскоўскім тэатры імя Пушкіна, у МХАТе. Выканаўца ролі Уладзіміра Леніна ў тэатры і кіно.



**1961** год — на дыпламатычнай канферэнцыі ў Рыме была прынята Міжнародная канвенцыя аб ахове правоў выканаўцаў, вытворцаў фанаграм і вяшчальных арганізацый (Рымская канвенцыя). З'яўляецца асноўным міжнародным пагадненнем, дзеючым у сферы аховы правоў стваральнікаў твораў у галіне музыкі, драматургіі, літаратуры, выяўленчага мастацтва.

**1976** год — у Савецкім Саюзе праведзены запуск спадарожніка сувязі «Экран» для тэлевізійнага вяшчання.

**Так гаварыў...**

**КАРЛ СЕНДБЕРГ:**
*«Мёртвыя працягваюць валодаць толькі тым, што яны аддалі».*

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
| --- | --- | --- | --- |
| Мінск — | 7.57 | 17.49 | 9.52 |
| Віцебск — | 7.50 | 17.35 | 9.45 |
| Магілёў — | 7.48 | 17.39 | 9.51 |
| Гомель — | 7.41 | 17.39 | 9.58 |
| Гродна — | 8.12 | 18.04 | 9.52 |
| Брэст — | 8.09 | 18.09 | 10.00 |

### Месяц

*Першая квадра 22 кастрычніка. Месяц у сузор'і Авена.*

### Імяніны

*Пр. Златы, Веньяміна, Карпа, Мікіты.*
*К. Людмілы, Люцыяна.*



Фота Віктара ІВАНЬКАВА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Ён і яна:**
**— А ты праўда да мяне з казкі прыйшоў?**
**— Угу.**
**— А з якой?**
**— З добрай.**
**— Выгналі?**

Памаліцеся, калі ласка, за майго мужа, які трагічна нічога не падарыў мне на гадавіну нашага вяселля, бо я сказала, што нічога не хачу.

**— На што скардзіцеся?**
**— Ды вось жонка кажа, што я нейкі нерашучы.**
**— А самі вы як думаеце?**
**— Ну, як бы і так, і не.**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
для зваротаў: zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by



Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.



Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 11.544. Індэкс 63850. Зак. № 2459.

| | | | | | | | | | | | | |
| --- | --- | --- | --- | --- | --- | --- | --- | --- | --- | --- | --- | --- |
| М | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| П | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |

Нумар падпісаны ў 19.30 25 кастрычніка 2023 года.